


П'ЕСА ПРА ЗМАГАННЕ ЗАХОДНІХ БЕЛАРУСАЎ 12

БЕЛАРУСКІ БУКВАР ЯК БРЭНД І КАНСТЫТУЦЫЯ КРАІНЫ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛЮТАГА 2022 г. АЎТОРАК № 30 (29652)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта:**

*«Праблему разрастання Мінска можна вырашыць толькі адным спосабам — актыўным будаўніцтвам у гарадах-спадарожніках. На гэты момант у Смалявічах вядзецца будаўніцтва шэрагу дамоў. Усяго іх запланавана 19, і налета яны будуць завершаны. Сёння вельмі шмат жадаючых пасяліцца ў гэтых дамах. У сярэднім на адно месца прэтэндуюць 4-5 чалавек, у сувязі з тым, што кожны жыхар Мінска, незалежна ад яго пастаноўкі на ўлік, можа заяўляцца на будаўніцтва ў такіх гарадах і ў самыя кароткія тэрміны яго атрымаць. Летась была завершана рэканструкцыя дарогі да Смалявіч. Акрамя таго, цяпер ідзе пашырэнне чыгункі, таму з транспартнымі зносінамі праблем узнікаць не павінна».*

# СЕРАБРО З ЗАЛАТЫМ АДЛІВАМ

BEIJING 2022



Фота БелТА.

Наша Ганна ГУСЬКОВА заваявала «серабро» ў спаборніцтвах па лыжнай акрабатыцы. У суперфінале Ганна атрымала 107,95 бала за свой скачок. Алімпійскай чэмпіёнкай стала кітайская спартсменка Ксю Ментаа, на трэцім месцы — Меган Нік, прадстаўніца ЗША.

З сярэбраным вынікам Ганну Гуськову павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Дарагая Аня! Чакалі! Мы вельмі чакалі гэтага медаля! Віншую! Гэта серабро — з залатым адлівам, таму што апярэдзіла цябе толькі прадстаўніца краіны — гаспадыні Алімпійскіх гульняў. Гонар за цябе і нашу школу фрыстайла!» — сказана ў віншаванні.

Не хавала эмоцый і гераіня дня. Сваімі пачуццямі яна падзялілася з прэс-службай НАК Беларусі. «Калі прызямлілася пасля вырашальнай спробы, зразумела, што зрабіла ўсё, што магла. Эмоцыі перапаўняюць! Адзначу, што гэты скачок мінулым разам я скакала ў Пхёнчхане чатыры гады таму. Рашэнне выконваць такі складаны скачок мы прынялі ўжо на схіле, калі пасля другой спробы я зразумела, што трэба ісці ва-банк. Была ўпэўненая ў сваіх сілах, праўда, яго было вельмі складана зрабіць, бо ў мяне ён быў толькі ў галаве. Вялікі дзякуй усім, хто за мяне перажываў, падтрымліваў, хварэў, мы зрабілі гэта разам. Я не магу паверыць сваім вачам, што гэта адбылося. Ура!» — выказалася Ганна Гуськова.

З вялікім поспехам Ганну Гуськову павіншаваў і прэзідэнт НАК Беларусі Віктар Лукашэнка.

## КОРАТКА

- **Следчы камітэт запускае флэшмоб па прафілактыцы наркаманіі #Поговорисподростком.**
- Жыхары Брэста падарылі дзіцячай абласной бальніцы амаль 80 кніг.
- **Больш за 4,75 мільёна беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.**
- У Гродне ўчора распусціліся першыя вясновыя кветкі — падснежнікі.



ISSN 1990 — 763X

22030

Сучасныя тэхналогіі

# НА СТЫКУ НАВУКІ І ВЫТВОРЧАСЦІ

**У Магілёўскім Беларуска-Расійскім універсітэце адкрылася перадавая вучэбна-практычная лабараторыя BRU-BOSCH Diagnostics**



**Гэта адпавядае сусветным тэндэнцыям і патрабаванням часу. Лабараторыя вядомага лідара па вытворчасці арыгінальнага аўтамабільнага абсталявання BOSCH стане для будучых спецыялістаў аўтапрама добрай пляцоўкай для практыкі.**

Яна з'явілася дзякуючы доўгатэрміноваму супрацоўніцтву кафедры «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў» і фірмы ТАА «Роберт БОШ».

СТАР. 11

Кампетэнтна

# Мэтавая падрыхтоўка і цэнтралізаваны экзамен

**Якія важныя нюансы трэба ведаць абітурыентам і іх бацькам?**

**Змяненні, якія знайшлі адлюстраванне ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, адпавядаюць духу часу — яны закліканы зрабіць адукацыю больш гібкай і больш эфектыўнай. Так лічыць начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі нашай краіны Сяргей КАСПЯРОВІЧ.**

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «Мы праводзілі выразную, зразумелую палітыку да ўкраінскага народа»

## Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з украінскім палітыкам Аляксандрам Марозам

**Аляксандр Лукашэнка, вітаючы госця, падзякаваў яму за стойкасць і прыхільнасць уласным ідэалам. «Я спадзяваўся, што вы не заблытаецеся. Спектр меркаванняў быў шырокі. Вы памятаеце гэта не горш за мяне. Я рады, што мы з вамі сустракаемся дзякуючы таму, што вы захавалі мужнасць, стойкасць, не страцілі свае перакананні ў той няпростай сітуацыі, што складваецца вакол нас — Беларусі, Украіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Ён заявіў: на сустрэчы не варта расказваць пра сучасны стан беларуска-ўкраінскіх адносін і аналізаваць іх, шукаючы вінаватых, — усе разумеюць, што адбываецца. «Яшчэ раз хачу публічна сказаць вам. Мы да абвастрэння нашых сувязяў не маем практычна ніякіх адносін. Мы праводзілі выразную, зразумелую палітыку да ўкраінскага народа. І зараз я прытрымліваюся гэтай палітыкі. Мы родныя людзі, суседзі. Гэта ад Бога. І будучыня наша павінна складвацца як у суседзяў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Мароз зрабіў рэмарку: пацвярджэнне слоў Прэзідэнта — 200 тысяч украінцаў, якія жывуць у Беларусі. Ён ужо другі раз за чатыры месяцы прыязджае ў нашу краіну і бачыць, як паспяхова яна развіваецца. Аляксандр Мароз расказаў, што, калі знаходзіўся ў бальніцы, напісаў кнігу «У чырвоным аддзяленні». У адным з раздзелаў ён метафарызуе, што ўся Украіна зараз быццам бы знаходзіцца ў «чырвоным аддзяленні». «Галоўны дыягназ — гэта бездзяржаўнасць, залежнасць ад знешняга кіравання, з чым нельга мірыцца», — адзначыў палітычны дзеяч.

Прэзідэнт згадзіўся і дадаў: дакладна ведае, што трэба Захаду ў нашым рэгіёне. «Патрэбна тут развязаць канфлікт. Яны ўмеюць зрабіць гэта чужымі рукамі, а яшчэ лепей паваяваць чужымі рукамі і чужымі людзьмі: «Няхай гінуць там украінцы, рускія, беларусы», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Ён працягнуў, што тым часам свету навязваецца гісторыя наконт будучай вайны на Украіне. «Зараз гвалт: «Вайна. Вайна!» Слухайце, калі б планавалі нейкую вайну супраць Украіны, па-іншаму паводзілі б сябе СМІ. Бо СМІ — гэта падрыхтоўка сучаснай вайны. Як толькі сціхаюць на імгненне гэтыя крыкі аб вайне на Украіне, з Амерыкі зноў ідзе сігнал, і гісторыя пачынае падагравацца. Зразумела, каму патрэбна гэта вайна», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго словах, яшчэ да «гісторыі наконт вайны» было прынята рашэнне аб сумесных беларуска-расійскіх вучэннях на поўдні нашай краіны. Прэзідэнт падкрэсліваe: яны неабходныя былі, каб вызначыць, дзе трымаць невялікую колькасць войскаў для папярэджвання небяспекі, што зыходзіць з боку Украіны, — паток зброі, фарміраванне лагераў, вучэнні.

«Адтуль ідзе прыток дыверсантаў, шчыра кажучы. Нам неабходна неяк прывядзіць у парадак граніцу. Пры гэтым мы павінны захаваць з украінцамі пямежжа добрыя адносіны, не перашкаджаць ім грыбы, ягады збіраць, як тое было раней. Няпростае пытанне. Таму мною было прынята рашэнне — правесці вучэнні і ў выніку вызначыць, на якіх напрамках трэба трымаць Узброеныя Сілы», — расказаў Прэзідэнт.

На сустрэчы з Уладзімірам Пуціным Аляксандр Лукашэнка прапанаваў зрабіць вучэнні сумеснымі. У тым ліку для таго, каб беларускія ваенныя маглі навучыцца валодаць сучаснай зброяй. «Расія пайшла на гэта. Дала нам зброю — С-400, «Іскандэры» і іншую сучасную тэхніку, каб мы маглі яе вывучаць. Ён (Уладзімір Пуцін. — **«Зв.»**) згадзіўся: «Добра. Мы падключымся». Падключыліся. Чаго крычаць, што мы тут нешта супраць Украіны ствараем? Іншы фон. Сёння гвалтам крычаць: «Калі выведзеце войскі?» Гэта наша з Пуціным справа. Вось мы ў найбліжэйшы час сустрэнемся і прымем рашэнне разам з Прэзідэнтам Расіі: калі, у якія тэрміны, па якім графіку выводзіць адсюль Узброеныя Сілы Расійскай Федэрацыі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён папрасіў звярнуць увагу, што амерыканцы, брытанцы і іншыя еўрапейскія краіны перакідваюць тысячы сваіх ваенных да беларускай граніцы — у Польшчу, Прыбалтыку.

«Паўстае пытанне: калі вы іх выведзеце адсюль? Яны пра гэта не кажуць, а ціснуць на нас. Выведзем тады, калі мы вырашым з Прэзідэнтам Расіі гэта зрабіць і калі скончацца тут вучэнні. Гэта мы будзем прымаць рашэнне. Гэта наша тэрыторыя. А гэта брахня наконт таго, што вось тут Лукашэнка гатовы напасці на Украіну — мне гэта ніколі не было патрэбна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў сваё абурэнне: тое, што твораць улады Украіны супраць Беларусі, розуму не паддаецца — пачалі ціск на Беларускую калійную кампанію. Для гэтага, дадаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуліся да амерыканцаў з просьбай замясціць беларускі экспарт калійных угнаенняў. «Амерыканцы даюць адказ: «Не, не можам. У нас няма калійных угнаенняў». Яны ж самі ў Канадзе купляюць, праз мяжу. Гэта ж трэба?! У Амерыку звяртацца, каб закупіць! Уявіце, які кошт: здабыць, перапрацаваць, адвезці чыгункай, у партах пагрузіць і сюды за тысячы кіламетраў прыплывуць судны. Тут зноў перавалка, чыгунка, і пакуль давязуць да сялян, на парадак даражэй будзе. Навошта вы гэта робіце пры такой сітуацыі?» — задаў рытарычныя пытанні Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што падтрымаў украінцаў некалькі тыдняў таму ў крызіснай сітуацыі недахопу электрычнасці — паставілі ім энергію звыш таго, што прасілі.

«Чаму так адбываецца? Чаму перад усімі закрылі неба для пералётаў нашых самалётаў? Ды абляцім мы. А калі мы з Расіяй дамовімся, і Расія закрые вылет самалётаў з Украіны: і ўкраінскіх, і іншых? Паставіць кропкі ўваходу ў Расію праз Беларусь? Што будуць рабіць?» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён сказаў, што ў ранейшыя часы зрабіў многа для ўрэгулявання канфлікту ва Украіне і для таго, каб улады Расіі і Украіны змаглі дамовіцца.

«І Парашэнка (Пётр, былы Прэзідэнт Украіны. — **«Зв.»**) згадзіўся. Потым каманда прыйшла з-за акіяна, і ён адышоў ад дамоўленасцяў. Ужо б на Данбасе не было вайны. Пуцін паабяцаў грошы, аднавіць Данбас. Людзі б спакойна жылі. Не! Гэта што за палітыка?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

Суразмоўца адказаў: «Вы ж разумееце, што гэта не палітыка Украіны — гэта выкананне чужых загадаў».

«Пра тое і размова», — дадаў беларускі Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

Па традыцыі журналісты пасля сустрэчы задалі свае пытанні госцю. Першае — як людзі ва Украіне ставяцца да ваеннай рыторыкі ўлады. «Іх, безумоўна, турбуе небяспечнасць вайны. Хоць большасць ставіцца індыферэнтна да таго, што адбываецца, бо разумее: перадумоў няма», — сказаў **Аляксандр МАРОЗ.**

Ён адзначыў, што ўжо 30 гадоў выказваецца катэгарычна супраць прасоўвання НАТА на Усход і далучэння Украіны да арганізацыі. Гэта, на яго думку, зменіць геапалітычную сітуацыю ў свеце.

Палітычны дзеяч заклікае краіны дамаўляцца, думаць разам, як пазбегнуць супрацьстаяння, і заўважае, што ўкраінцы пераважна вельмі добра гавораць пра Беларусь і яе развіццё.

«Мяне і маіх сяброў хвалюе тое, што гэта абвастрэнне можа дрэнна скончыцца для ўсіх нас. Гэтага нельга дапусціць. Я хацеў папрасіць Аляксандра Рыгоравіча, каб ён у меру сваіх магчымасцяў дапамог пагасіць напружанне. На гэта ён выказаў згоду. Гэта вялікая справа. Я дэталі не буду казаць, што мяркуецца зрабіць. Калі адбудзецца, то адбудзецца. Але гэта павінна паўплываць на знясце штучнага напружання. Яно створана не ўкраінскай уладай, не расійскім бокам, а ў інтарэсах тых, хто сядзіць за акіянам», — выказаў журналістам свае думкі дзяржаўны дзеяч.

**Даведка:** Аляксандр Мароз — палітычны і дзяржаўны дзеяч Украіны. У 1994—1998, 2006—2007 гадах займаў пасаду старшыні Вярхоўнай Рады, у 1991—2012 гг. кіраваў Сацыялістычнай партыяй Украіны. Пасля быў вядучым аўтарскай праграмы «Тварам да агню» на радыёканале «Культура».

### Тым часам

**Учора па ініцыятыве ўкраінскага боку адбылася тэлефонная размова міністра абароны Беларусі генерал-лейтэнанта Віктара Хрэніна з міністрам абароны Украіны Аляксеем Рэзнікавым, паведамілі ў Міністэрстве абароны.**

Бакі абмеркавалі пытанні бягучага стану супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, існуючыя болевыя кропкі, а таксама канкрэтныя крокі па ўмацаванні атмасферы даверу і бяспекі ў рэгіёне.

У час размовы Віктар Хрэнін адзначыў, што народ Украіны быў і будзе для Беларусі братэрскім народам. Беларусь не з'яўляецца ініцыятарам напружанасці ў адносінах Беларусі і Украіны.

Кіраўнік ваеннага ведамства Украіны Аляксей Рэзнікаў выступіў за аднаўленне супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, а таксама актывізацыю супрацоўніцтва па пытаннях бяспекі і ўзаемнага даверу.

Віктар Хрэнін падкрэсліў, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка неаднаразова заяўляў: «Важная задача — не страціць братэрскі народ Украіны. Усё можна паправіць: эканоміку, тавараабарот, дыпламатычныя адносіны. Духоўная сувязь нашых народаў не павінна даць трэшчыну. І мы не можам дапусціць разрыву братэрскіх сувязяў паміж народамі».

Міністры абмеркавалі правядзенне мерапрыемстваў падрыхтоўкі Узброеных Сіл. І выказалі ўпэўненасць, што гэтыя мерапрыемствы не нясуць пагроз бяспекі братэрскім краінам.

Кіраўнікі ваенных ведамстваў абазначылі канкрэтныя крокі па мерапрыемствах павышэння транспарэнтнасці і ўзаемнага даверу.

Размова адбылася для аднаўлення атмасферы дыялогу, зніжэння градуса публічных праяў і забеспячэння бяспекі ў рэгіёне.

---

Саюзная рашучасць — 2022

# БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ — З НОВЫМІ СІЛАМІ

## Ваеннаслужачыя дзвюх краін працягваюць узаемадзейнічаць і ўдасканальваць свае майстэрства на полі бою

**Учора на палігоне «Брэсцкі» ўдзельнікі беларуска-расійскага вучэння «Саюзная рашучасць — 2022» паспяхова знішчылі незаконнае ўзброенае фарміраванне, а таксама не дапусцілі яго пранікнення на важныя аб'екты, якія, па задуме канкрэтнага эпізоду манеўраў, ахоўваліся.**

Абарончы бой быў праведзены на палігоне «Гожскі». Падраздзяленні асобнага гвардзейскага механізаванага батальёна 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады падчас розыгрышу тактычнага эпізоду выконвалі задачы вядзення абарончых дзеянняў на рубяжы манеўранай абароны, выхаду з boю і адыходу на чарговы рубеж. Войскі дзейнічалі пры падтрымцы танкавага і артылерыйскіх падраздзяленняў, па ўмоўным праціўніку наносіліся авіяцыйныя ўдары сіламі авіяцыі Саюзнай дзяржавы — штурмавікамі Су-25 і Як-130, верталётамі Мі-8МТВ-5.

На ўчастку мясцовасці «Баранавічы» механізаваныя падраздзяленні Узброеных Сіл Беларусі і падраздзяленні марской пяхоты Расіі правялі вучэбны баявыя дзеянні на рубяжах манеўранай абароны. А на ўчастку мясцовасці «Гомель» падраздзяленні сіл спецыяльных аперацый Беларусі і Паветрана-дэсантных войск Расіі адпрацавалі задачы па пошуку, блакіраванні і знішчэнні дыверсійна-разведвальных груп умоўнага праціўніка і незаконных узброеных фарміраванняў. Расійскія ваеннаслужачыя ўдзельнічалі ва ўзмацненні ўчасткаў дзяржаўнай граніцы.

Зенітныя ракетныя падраздзяленні Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі на ўчастку мясцовасці «Лунінец» ажыццявілі супрацьпаветранае прыкрыццё войск, вырашалі задачы баявога дзяжурства па супрацьпаветранай абароне. Штурмавая авіяцыя расійскіх Паветрана-касмічных сіл на авіяцыйным палігоне «Ружанскі» адпрацавала пытанні авіяцыйнай падтрымкі войск, якія абараняліся, з прымяненнем авіяцыйных сродкаў паражэння. Выкананне вучэбна-баявых задач у межах сумеснага аператыўнага вучэння адбывалася і на іншых участках мясцовасці.

Падчас манеўраў задзейнічаны практычна ўсе роды войск. Экзамен на прафесіяналізм трымаюць усе вайсковыя спецыяльнасці. Як адзначыў у інтэрв'ю тэлекампаніі «ВаенТБ» **начальнік сувязі — начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Алег МІШЧАНКА,** для сувязістаў гэта мерапрыемства не новае. «Узаемадзеянне з войскамі сувязі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі арганізавана на ўзроўні як тэхнічным, так і арганізацыйным, — падкрэсліў генерал-маёр. — Да гэтага праводзіліся планавыя трэніроўкі. Нашы сістэмы сувязі поўнасцю судакранаюцца адна з адной, таму праблемных пытанняў для выканання задач па сувязі ў нас няма».

Як заўважыў **намеснік камандзіра брыгады матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (Расія) Якаў ГАСЦЯЕЎ,** узаемадзеянне патрэбна для таго, каб вучыць адзін аднаго. «Мы паказваем, што ёсць у нас, беларусы — што ёсць у вас, — гаворыць ваеннаслужачы. — Мы браты, як кажа ваш Прэзідэнт, таму павінны дзяліцца адзін з адным вопытам, дапамагаць адзін аднаму ва ўсім».

Прычым вайскоўцы дзвюх краін не толькі сумесна выконваюць пастаўленыя задачы. Разам яны праводзяць і вольны час. Наведваюць знакавыя мясціны нашай краіны, вывучаюць музейныя экспазіцыі. У нядзелю перад удзельнікамі вучэння выступілі творчыя калектывы нашай краіны. **Намеснік камандзіра ўзвода (Беларусь) Максім МІНАКОЎ** перакананы, што ў сувязі з тым, што вайскоўцы знаходзяцца падчас вучэння ў пастаянкай загружанасці, такія мерапрыемствы неабходныя для таго, каб разгрузіцца, набрацца станоўчых эмоцый і з новымі сіламі зноў паглыбіцца ў ваенную тэматыку і выконваць баявыя задачы, якія ставяць камандзіры.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Разумную пазіцыю беларусаў чуваць ва ўсім свеце»


Фота БелТА.

**У Мінску адбыўся патрыятычны кангрэс Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. Больш за тысячу чалавек сабралася, каб абмеркаваць галоўную падзею ў грамадска-палітычным жыцці краіны — хуткі рэферэндум па змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Сярод запрошаных — дэлегаты партыі з усіх рэгіёнаў краіны, прадстаўнікі дружалюбных палітычных партый, грамадскіх арганізацый, грамадзянскай супольнасці блізкага і далёкага замежжа, дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі.**

«Прэзідэнт неаднаразова казаў, што грамадзянская супольнасць у Беларусі ёсць. Дык вось яна яна. Ёсць і Федэрацыя прафсаюзаў, і «Белая Русь». Патрыётаў хапае. Паглядзіце, як шматразова за гэтыя два гады вырас і журналісцкі пул. Кажуць, што няма сярод нас моладзі, бізнесменаў — вось яны, таксама сёння тут ёсць. Гэтым суботнім днём усе сабраліся выключна па ўласным жаданні. Задача сённяшняга мерапрыемства не толькі вузка партыйная. Мы паклікалі сяброўскія арганізацыі, «Патрыётаў Беларусі», камуністаў. Усім, хто жадаў выказацца, — дадзім слова. Можна мець розныя погляды, але краіна адна», — сказаў **Алег ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня ЛДПБ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў.**

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што рэферэндум, які адбудзецца 27 лютага, — важны для кожнага беларуса. «Можам спрачацца пра нейкі артыкул, але ёсць некалькі шляхоў развіцця краіны: вуліца, рэвалюцыя, умяшанне звонку. І ніколі мы гэта не падтрымлівалі. Тут усе палітычныя партыі павінны стаяць разам. У нас розныя праграмы, але ў гэтым мы будзем стаяць разам і да канца», — падкрэсліў Алег Гайдукевіч.

Адна з мэт кангрэса — расказаць, чаму важна не проста прыйсці на рэферэндум, а падтрымаць праект абноўленай Канстытуцыі. «Мы хочам паказаць, што Беларусь у свеце не адна і нас падтрымлівае шмат людзей у Літве, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Сербіі. Не кажучы ўжо пра Расію і Кітай. Гэта міф, што мы адны. І сёння разумную пазіцыю беларусаў чуваць ва ўсім свеце», — рэзюмаваў Алег Гайдукевіч.

Старшыня ЛДПБ падкрэсліў, што палітычная мадэрнізацыя патрэбна Беларусі, каб у будучыні не дапусціць развалу краіны. І гэта дазволіць зрабіць рэферэндум. А пасля грамадскага кансэнсусу будзе падтрымліваць абноўленую Канстытуцыю і грамадзянская супольнасць. Ён адзначыў, што для дзяржавы аднолькава шкодныя дзве крайнасці — рэвалюцыі і застой. «Таму мы за рэферэндум. Заходнія палітыкі, усялякія іх аналітычныя цэнтры разумеюць, што на рэферэндуме разгайдаць сітуацыю не змогуць. Але яны жывуць чаканнямі транзітаў. Што Лукашэнка рана ці позна сыдзе, Пуцін сыдзе — і ўсё ў нас разбурыцца. Мы павінны адказна мадэрнізаваць сваю палітычную сістэму. Нічога не рабіць — значыць скаціцца да застою», — заявіў Алег Гайдукевіч.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў заклікаў усіх прыходзіць на рэферэндум. Для краіны гэта крок наперад.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «ВЕЛЬМІ ХОЧАЦЦА, КАБ НАШЫ ЛЮДЗІ ЖЫЛІ МІРНА»

## Як памяць аб вайне вымушае асабліва даражыць тым, што маем

**Пятнаццатага лютага, 33 гады таму, скончылася вайна, якая ішла за тысячы кіламетраў ад нашай зямлі, а абярнулася болем для соцень беларускіх сем'яў. З далёкага Афганістана яны не дачакаліся жывымі сваіх родных і блізкіх, хтосьці вярнуўся пакалечаны і целам, і душой. У памятную дату асабліва хочацца звярнуць увагу на артыкул 18 Канстытуцыі, якая выносіцца цяпер на рэферэндум. Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці граніц, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права. Змяненні і дапаўненні прапанаваны да часткі другой артыкула 18, якая сфармулявана так: «Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў адносінах да іншых дзяржаў».**


**Жыхары аг. Нісімкавічы Чачэрскага раёна дапамаглі ўстанавіць мемарыяльны комплекс памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.**

Пра жахі вайны ў любых яе праявах, пра найвялікшую каштоўнасць міру размаўляем з дэпутатамі, дэлегатамі VI Усебеларускага народнага сходу, актыўнымі дзеячамі Чачэрскай і Гомельскай раённых арганізацый «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Жаннай Малінавай і Алегам Кавалёвым.

Жанна Малінава, дэпутат Чачэрскага райсавета, старшыня Нісімкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў, вядомая актыўнай падтрымкай раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Дванаццаць гадоў запар 15 лютага на тэрыторыі свайго сельсавета сустракае дэлегацыю воінаў-афганцаў з усёй Чачэршчыны, а іх сёння больш за трыццаць чалавек.

— Штогод мы разам з салдатамі-інтэрнацыяналістамі з усяго раёна наведваем магілкі ў вёсках Загор'е, Сідаравічы і Барсукі, дзе пахаваны нашы хлопцы-афганцы, аддаём ім даніну павагі, — расказвае Жанна Малінава. — Пасля ў знамянальную гадавіну па чарзе жыхары нашых буйных населеных пунктаў Сідаравічаў, Нісімкавічаў і Бабічаў рыхтуюць у сваіх вясковых клубах вечар памяці ў гонар воінаў. Асабліва важна, што так у вечарах памяці можа кожны год паўдзельнічаць усё больш дзяцей, — тлумачыць дэпутат, у якой за плячыма амаль 20 гадоў працы настаўнікам: для яе патрыятычнае выхаванне і грунтуецца на такой рабоце з дзецьмі.

Сёлета дэлегацыю сустракаюць у Нісімкавічах. Да знамянальнай даты ў аграгарадку прымеркавалі адкрыццё мемарыяльнага комплексу. Размясціўся ён на алеі воінаў-інтэрнацыяналістаў, закладзенай у 2018 годзе.

— Дрэвы высадзілі такім чынам, каб атрымалася зорка. Цяпер цэнтр алеі — мемарыяльная кампазіцыя са знакаў-сімвалаў для ўсіх воінаў-афганцаў. З металу зроблены цалкам, як рэальныя ўзнагароды, «Афганка» і «Знак воінаў-інтэрнацыяналістаў», якія атрымалі нашы хлопцы за тую службу. З металу таксама вылілі гільзу з чорным цюльпанам, над якім ляціць самалёт, — тлумачыць Жанна Мікалаеўна. — Акрамя таго, устанавілі памятны знак з граніту, сродкі на які ахвяравала кіраўнік нашага сельгаспрадпрыемства ААТ «Звязда» Галіна Трыбунах. Дарэчы, гэта гаспадарка кожны год аказвае дапамогу ў набыцці памятных сувеніраў для дэлегацыі воінаў-афганцаў з раёна.

А вось сімвалічную мемарыяльную кампазіцыю з металу сваімі рукамі зрабіў Міхаіл Пятровіч Малінаў, муж Жанны Мікалаеўны. У яго за плячыма Тахта-Базарскі, Бахардэнскі, Пянджскі і Маскоўскі пагранічныя атрады, якія служылі ў Афганістане. Аб тым сваім вопыце паважаны воін-інтэрнацыяналіст шмат расказваць не любіць. Як у іх сям'і шануюць памяць герояў вайны, расказвае Жанна Малінава:

— Мне было сямнаццаць, толькі паступіла ў Гомель вучыцца на настаўніцу, а майго роднага брата Колю забралі, як мы казалі, у Афган. Служыў ён у самім Кабуле. Я з Гомеля пісала кожныя два дні, а адказы атрымлівала толькі праз некалькі месяцаў. Потым брат атрымаў раненне, мы нічога не ведалі аб ім больш як чатыры месяцы. Страшна тое, што пайшоў ён маладым хлопцам, а вярнуўся дадому іншым чалавекам. Гэта вайна ламала. Вярталіся пакалечаныя не толькі цялесна. Пасля гібелі людзей побач іх душам ужо не было спакою.

Брата Жанны Малінавай Мікалая не стала шэсць гадоў таму, але расказваць пра яго ёй дагэтуль складана. Успамінае яна, як тады, больш чым 30 гадоў таму, іх вяскоўцы чакалі назад сваіх хлопцаў-афганцаў:

— Для нашай сям'і ўвогуле гэта было вельмі цяжка, бо накіравалі тады на службу майго роднага і стрыечнага братоў, забралі і іх аднакласніка, з якім выраслі побач. Гэта быў наш воін-інтэрнацыяналіст Уладзімір Глыбоўскі. Добра памятаю: надзвычай сонечны дзень, а яго, Валодзю, прывезлі ў вёску ў цынкавай труне. Гора для ўсіх вяскоўцаў. Памятаю, што дзеці і моладзь вельмі перажывалі. Тры дні пасля пахавання ніхто не ўключаў музыку ў знак смутку.

У Гомельскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» сёння 176 чалавек. Старшыня ветэранскай арганізацыі, воін-інтэрнацыяналіст Алег Мікалаевіч Кавалёў 35 гадоў жыцця аддаў рабоце з дзецьмі. Настаўнік фізкультуры і здароўя Яромінскай сярэдняй школы, вядомы ў раёне спартсмен пайшоў у армію ў 18. Вясковы хлопец, адзін сын у маці ў 1980 годзе трапіў на службу ў Кабул.

— Тады ж, калі хлопец не паслужыў у арміі, дзяўчаты з ім не сталі б нават размаўляць, — дзеліцца Алег Мікалаевіч. — Калі камандзір батальёна ўсіх спытаў «Хто жадае пайсці ў Афганістан?», згадзіўся


**На ўроку — настаўнік Яромінскай школы старшыня Гомельскай раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Алег КАВАЛЁЎ.**

адразу. Служыў у Кабуле, у войсках сувязі.

— Сярод ветэранаў — воінаў-інтэрнацыяналістаў у нашым раёне асноўная колькасць — менавіта салдаты-афганцы, простыя вясковыя хлопцы, што пайшлі служыць адразу пасля школы. Яны вельмі сціплыя, губляюцца, калі просіш выступіць, расказаць пра сябе перад аўдыторыяй. Я таксама ўжо колькі гадоў займаюся гэтай работай, а калі на вечарах памяці ўспамінаюць службу, прызнаюся, цярплю-цярплю, але не магу стрымацца: слёзы пачынаюць ліцца. Просяць выступіць са сцэны, а я не магу — клубок дагэтуль падкотваецца да горла ад успамінаў.

На працягу 35 гадоў у роднай вёсцы Алег Мікалаевіч завяваў павагу сваім апантаным стаўленнем да фізкультуры. З дзяцінства займаўся футболам, а цяпер, гаворыць, з тых, каго прывучыў да гэтага віду спорту, можна стварыць некалькі футбольных каманд. Гісторыя жыцця гэтага чалавека — прыклад таго, як ветэран афганскай вайны, які доблесна выконваў свой воінскі абавязак, на радзіме змог таксама добра паслужыць на карысць аднавяскоўцам, не шкадаваць сілы ў рабоце з дзецьмі, выхоўваць у вучнях любоў да Радзімы.

Вясковы настаўнік сціпла ўспамінае пра свой нялёгкі армейскі вопыт. Гонар і павага да сяброў па той службе для яго не проста словы:

— Мы выжылі, і гэта самае галоўнае. Мы самі да таго ў звычайным жыцці не разумелі, напрыклад, што такое каштоўнасць кавалка хлеба. Многа чаму той вопыт навучыў мяне. Мы, «афганцы», апошнія, каму прыйшлося ваяваць... Вельмі хочацца, каб нашы людзі заўсёды жылі мірна. І вельмі добра, што наша міралюбівая палітыка знайшла сваё адлюстраванне ў Асноўным Законе...

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара і з архіва герояў.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# Мэтавая падрыхтоўка і цэнтралізаваны экзамен

## У інтарэсах заказчыкаў кадраў

— Мы на ўсіх стадыях падрыхтоўкі Кодэкса ўлічвалі практыку, якая складваецца, а яна нярэдка апярэджвае заканадаўства. Праводзіўся аналіз практыкі рэалізацыі асобных нормаў: наколькі яны працуюць і наколькі эфектыўныя? Таксама аналізаваўся замежны вопыт. Хачу заўважыць, што Кодэксам рэгламентуецца толькі парадак прыёму на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а прыём на ўзровень сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі рэгламентуецца Указам Прэзідэнта, які зацвярджае Правілы прыёму, — тлумачыць Сяргей Каспяровіч. — Што датычыцца вышэйшай адукацыі, то ўсе змяненні, занатаваныя ў Кодэксе, носяць сістэмны характар. Па-першае, адбыліся змяненні ў структуры вышэйшай школы. Цяпер у нас тры віды вышэйшай адукацыі: агульная вышэйшая — гэта бакалаўрыят з тэрмінам навучання 4-4,5 года, паглыбленая, накіраваная на падрыхтоўку спецыялістаў для навукова-інавацыйнай сферы — магістратура (1-2 гады) і спецыяльная — неперарыўная адукацыя па найбольш складаных спецыяльнасцях, накіраваных на падрыхтоўку спецыялістаў для медыцыны, ядзернай энергетыкі і іншых сфер. Там тэрмін навучання складзе 5-6 гадоў. Такая структура вышэйшай адукацыі будзе больш зразумелая для нашых партнёраў як з Захаду, так і з Усходу.

Таксама хацелася б адзначыць трансфармацыю падыходаў да фарміравання зместу адукацыі, павышэнне гібкасці на ўсіх узроўнях прафесійнай адукацыі, адыход ад залішняй дэталізацыі, у прыватнасці, выключэнне спецыялізацый і кірункаў спецыяльнасцяў, што дазволіць установам адукацыі сістэмна, планамерна і, галоўнае, хутка змяняць змест адукацыі ў залежнасці ад патрэб заказчыкаў кадраў.

## Павысіць шанцы на паступленне

Яшчэ адзін важны момант, на які звярнуў увагу кіраўнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі, гэта вывядзенне на новы ўзровень мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў: комплексныя рашэнні знайшлі сваё адлюстраванне і ў Кодэксе аб адукацыі, і ў новых Правілах прыёму.

— З аднаго боку, цяпер зняты абмежаванні на месца знаходжання арганізацый — заказчыкаў кадраў. Калі раней мэтавая падрыхтоўка распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер дагаворы на мэтавую падрыхтоўку могуць заключаць арганізацыі і прадпрыемствы, размешчаныя ў тым ліку ў сталіцы і абласных цэнтрах. Заўважу, што дадзеная норма ўступае ў дзеянне ўжо з 1 сакавіка 2022 года, — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч. — Адначасова з гэтым у Правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы прадугледжана павелічэнне гранічных квот у рамках мэтавай падрыхтоўкі: на сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму, па медыцынскіх — да 80 працэнтаў і па іншых спецыяльнасцях — да 60 працэнтаў. Гэтыя квоты ўступаць у сілу ў 2023 годзе і абітурыентаў бягучага года яны не закрануць. Вядома, 60, 70 і 80 працэнтаў — гэта максімальная планка. І тут ёсць шмат акалічнасцяў. Ці знойдзецца столькі заказчыкаў, гатовых праілічыць свае патрэбы ў кадрах на 4-5 і больш гадоў наперад? Ці будуць гатовыя абітурыенты заключаць дагавор на мэтавую падрыхтоўку? Сёння такія дагаворы заключаюцца на пяць гадоў адпрацоўкі на заказчыка кадраў пасля атрымання вышэйшай адукацыі і на тры гады — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Па маіх адчуваннях, на медыцынскіх спецыяльнасцях дастатковая колькасць заказчыкаў кадраў знойдзецца. Пры такім раскладзе на звычайны конкурс для ахвотных паступіць на бюджэт месцаў застанецца менш, таму што мэтавыя месцы — гэта бюджэтныя месцы. І абітурыентам, каб павысіць свае шанцы на паступленне, давядзецца рабіць выбар на карысць мэтавай падрыхтоўкі.

Сяргей Каспяровіч прывёў прыклад, як гэта будзе выглядаць на практыцы. Скажам, на спецыяльнасці «аўтамабілебудаванне» прадугледжана 30 бюджэтных месцаў. Квота на мэтавы прыём складае 60 працэнтаў. Значыць, да 18 месцаў можа быць выдзелена пад мэтавы прыём. Гэта тэарэтычна, а рэальна можа быць і 10, і 12 месцаў. Усё будзе залежаць ад таго, ці знойдуцца заказчыкі. Зыходзячы з практыкі, поўная квота будзе закрывацца не заўсёды.

Дарэчы, дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы можа заключацца і больш чым на пяць гадоў, а вось меншым тэрмін быць не можа.

— Варта разумець, што галоўныя ўдзельнікі дагавора — абітурыент і наймальнік. Кожны з іх узважвае ўсе «за» і «супраць» і вырашае, ці гатовы ён заключыць кантракт на больш перыяд. Напрыклад, на шэсць гадоў. Гэта толькі волевыяўленне абітурыента і заказчыка, — падкрэсліў спецыяліст. — Мне падаецца, што абітурыенту, які заключае кантракт на мэтавую падрыхтоўку з перспектыўнай арганізацыяй з добрым сацыяльным пакетам, можа быць цікава залажыць у дагаворы і больш за пяць гадоў. Але гэта ўсё будзе вырашацца ў кожным канкрэтным выпадку.

## Базавы ўзровень для ўсіх?

Яшчэ адзін важны момант, які датычыцца абітурыентаў 2023 года, — гэта з'яўленне цэнтралізаванага экзамену на выхадзе са школы па матэматыцы і беларускай ці рускай мове на выбар для ўсіх выпускнікоў. Яго вынік будзе ўплываць на канчатковую адзнаку, якая пойдзе ў школьны атэстат, а значыць, і на сярэдні бал атэстата.

Паводле слоў Сяргея Каспяровіча, у Міністэрстве адукацыі ёсць бачанне, што на цэнтралізаваным экзамене па матэматыцы заданні для ўсіх павінны быць аднаго ўзроўню складанасці. Магчыма, адзначыў ён, гэта будзе базавы ўзровень. «Кодэкс дае магчымасць у падзаконных актах усе гэтыя пытанні ўрэгуляваць. На гэта ў нас яшчэ ёсць час», — растлумачыў спецыяліст. Ён дадаў, што лічыць справядлівым, калі заданні будуць для ўсіх аднолькавыя — так, як гэта адбываецца і на ЦТ.

Такім чынам выходзіць, што матэматыку на базавым узроўні будуць здаваць усе: і выпускнікі агульнаадукацыйных класаў, у тым ліку абітурыенты гуманітарных спецыяльнасцяў, і выпускнікі профільных фізіка-матэматычных класаў.

Сяргей Каспяровіч паведаміў, што арганізацыя, падрыхтоўка экзаменацыйных матэрыялаў, іх праверка ўскладаецца на Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Папярэдне ўжо вызначана каля 100 пунктаў для правядзення цэнтралізаванага экзамену. А вось дастаўкай выпускнікоў у гэтыя пункты будуць займацца ўжо органы кіравання адукацыяй, яны павінны забяспечыць іх падвоз.

Сяргей Каспяровіч таксама паведаміў, што з 2023 года ў абітурыентаў будзе магчымасць здаць да трох ЦТ па любых прадметах, якія не здаюцца на цэнтралізаваным экзамене: па фізіцы, хіміі, гісторыі, замежнай мове і гэтак далей. У выніку пры паступленні ў абітурыента на руках можа аказацца да пяці сертыфікатаў: тры сертыфікаты ЦТ плюс два сертыфікаты цэнтралізаванага экзамену.

— Гэта забяспечыць маладым людзям шырокі выбар спецыяльнасцяў. Галоўнае — не заблытацца, — кажа Сяргей Каспяровіч. — Мяркуем, што маладыя людзі сістэмна паставяцца да выбару спецыяльнасці. А вось бегаць з веерам сертыфікатаў па вышэйшых навучальных установах і спрабаваць «уладкавацца» туды, куды яны падыходзяць, будзе няправільна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Меркаванне

### Прадпрыемствы змогуць рыхтаваць для сябе спецыялістаў

**Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**



— Адным з паказчыкаў узроўню развіцця любой дзяржавы з'яўляецца адукацыйны ўзровень насельніцтва, даступнасць і якасць адукацыі. Паводле даных Індэкса працвітання — 2021, які публікуецца брытанскім аналітычным цэнтрам The Legatum Institute, Беларусь займае 30-е месца (сярод 167 краін) па субіндэксе «Адукацыя», а ў адпаведнасці з рэйтынгам ЮНЕСКА — 8-е месца, што гаворыць пра высокі ўзровень адукацыі ў нашай краіне.

З 1 верасня ўстановы адукацыі Беларусі будуць выбудоўваць сваю дзейнасць паводле абноўленага Кодэкса аб адукацыі. Тыя змяненні, якія знайшлі адлюстраванне ў тэксце закона, дазволяць забяспечыць павышэнне якасці навучання і выхавання дзяцей і моладзі на ўсіх ступенях адукацыі.

Прэзідэнт краіны падчас выступлення з Пасланнем да беларускага народа і парламента звярнуў увагу на вялізны патэнцыял маладога пакалення і неабходнасць яго падтрымкі ўсімі інстытутамі дзяржавы. 23 студзеня Указам Прэзідэнта зацверджаны новыя Правілы прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, а таксама Правілы прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Вялікая ўвага аддаецца мэтавай падрыхтоўцы навучэнцаў. Любое прадпрыемства, установа, незалежна ад месца размяшчэння, будуць мець магчымасць падрыхтаваць спецыяліста, патрэбнага менавіта для канкрэтнай вытворчасці. Заказчык кадраў зможа больш патрабавальна падысці да выбару свайго будучага работніка, уважліва прыглядзецца да яго дзелавых якасцяў ужо на стадыі праходжання вытворчай практыкі. У сваю чаргу, будучы спецыяліст зможа літаральна з першых крокаў навучання прафесіі прыглядзецца да працоўнага калектыву, да свайго будучага рабочага месца, адчуць спецыфіку і нюансы будучай работы, а таксама ўбачыць перспектыву свайго развіцця і росту.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Канвой свабоды» дальнабойшчыкаў дабраўся да еўрапейскіх сталіц

**З канадскіх дальнабойшчыкаў узялі прыклад актывісты ў многіх краінах Еўропы. У мінулыя выхадныя «Канвоі свабоды» прайшлі па вуліцах Парыжа, Гаагі, Цюрыха. Цяпер актывісты рыхтуюцца «ўзяць» Брусель, паведамляе Euronews.**



Паводле даных МУС Францыі, вечарам 11 лютага ў Парыж з'ехалася да трох тысяч аўтамабіляў. У суботу сотні з іх удалося прарвацца на Елісейскія палі. Удзельнікі пратэсту выступілі не толькі супраць каранцінных абмежаванняў, але і выказвалі незадаволенасць агульнай эканамічнай сітуацыяй у краіне. Сталічныя ўлады вывелі на вуліцы сем з палавінай тысяч паліцэйскіх, якія разагналі ўдзельнікаў несанкцыянаванай маніфестацыі з дапамогай слёзатачывага газу. 97 чалавек былі затрыманы, на 513 складзены пратаколы.

У Нідэрландах «Канвой свабоды» блакіраваў доступ да ўрадавага квартала ў Гаазе. Удзельнікі акцыі выступілі супраць каранавірусных абмежаванняў, такіх як абавязковыя вакцынныя пропускі і маскі, але было чуваць іншыя лозунгі, напрыклад, супраць кліматычных законаў.

У Цюрыху ўлады таксама забаранілі акцыі. Паліцыя прымяніла слёзатачывы газ, вадамёты і гумавыя кулі. Некаторыя ўдзельнікі маніфестацыі ўсё ж змаглі правярнуць праз ачапленне.

Аднак галоўная мэта еўрапейскіх удзельнікаў «Канвою свабоды» — Брусель, сталіца Еўрасаюза.

### У Дзяржвуме падтрымалі два варыянты пастановы аб звароце да Пуціна прызнаць ДНР і ЛНР

**Профільны камітэт Дзяржаўнай думы па справах СНД, еўразійскай інтэграцыі і сувязях з суайчыннікамі 14 лютага падтрымаў два варыянты пастановы аб звароце палаты да прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна прызнаць Данецкую і Луганскую народныя рэспублікі, яны абодва накіраваны ў Савет Думы. Пра гэта паведамляе ТАСС.**

Адзін з праектаў быў унесены ў Дзярждуму дэпутатамі ад КПРФ на чале з яе лідарам Генадзем Зюганавым, за гэты дакумент прагаласавалі трое членаў камітэта. Другі праект унеслі першы намеснік старшыні камітэта Віктар Вадалацкі і намеснік старшыні камітэта Арцём Тураў.

Паводле слоў крыніцы агенцтва, другі варыянт пастановы таксама прадугледжвае заклік да прэзідэнта РФ прызнаць незалежнасць ДНР і ЛНР, але пасля кансультацый з Міністэрствам замежных спраў Расіі на прадмет захавання міжнародных дамоўленасцяў, уключаючы мінскія пагадненні.

### NYT: Зяленскі спрабуе прадухіліць паніку, але месца для манеўру мала

**Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі больш не адчувае аптымізму ў адносінах да Расіі. У той жа час у яго ўсё менш прастору для манеўру, каб знайсці спосаб урэгулявання расійска-ўкраінскага канфлікту, піша выданне The New York Times.**

«Мабыць, самы востры крызіс бяспекі ў Еўропе з часоў заканчэння «халодный вайны» назіраецца да апагея. Але 44-гадовы ўкраінскі прэзідэнт чапляецца за стратэгію, якой ён прытрымліваўся на працягу некалькіх месяцаў: Зяленскі выкарыстоўвае кожнае публічнае з'яўленне, каб перасцерагчы людзей ад панікі і празмернай рэакцыі. Такія паводзіны здаюцца амаль вар'яцкімі, улічваючы сур'ёзныя рызыкі, з якімі сутыкаецца яго краіна», — пішуць аўтары выдання.

Пасол Украіны ў Вялікабрытаніі Вадзім Прыстайка ў інтэрв'ю радыё «Бі-бі-сі — 5» заявіў, што Украіна можа адмовіцца ад уваходжання ў НАТА, дзеля таго каб пазбегнуць вайны з Расіяй у нібыта існуючых умовах пагроз і шантажу. Ён дадаў, што Кіеў можа «праявіць гібкасць».

Дзеля памяці

# НЕЗАГОЙНЫЯ РАНЫ ВАЙНЫ

## 33 гады таму завяршыўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана

**15 лютага 1989-га апошні савецкі салдат перайшоў мост пагранічнай ракі Амудар'я пад Тэрмезам. Афганская вайна, якая цягнулася доўгія дзесяць гадоў, яшчэ ў памяці многіх беларусаў-удзельнікаў тых падзей. На чужой зямлі абарваліся жыцці 771 нашага земляка, 870 беларусаў сталі інвалідамі, лёс 12 чалавек невядомы дагэтуль...**

Штогод, напярэдадні і ў сам Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, які адзначаецца сёння, ветэраны вайны ў Афганістане наведваюць калектывы, сустракаюцца з саслужыўцамі. І не толькі таму, каб згадаць незабыўнае, ушанаваць памяць тых, хто не дажыў да завяршэння сваёй інтэрнацыянальнай місіі, не дачакаўся сённяшняга дня, а і расказаць падрастаючаму пакаленню, што такое вайна і чаму мір — гэта найважнейшая каштоўнасць чалавецтва.

Было цікава назіраць, з якім настроем аповеды воінаў-інтэрнацыяналістаў слухалі вучні Маякскай сярэдняй школы са Слуцкага раёна. Сустрэча ветэранаў з маладым пакаленнем адбылася ў Слуцкім краязнаўчым музеі. Перад гэтым навуковы супрацоўнік Васіль Цішкевіч расказаў вучням пра іх землякоў, якія загінулі ў Афганістане, зачытаў ліст аднаго з іх да сваёй маці, паказаў рэчы воінаў-інтэрнацыяналістаў, якім пашчасціла вярнуцца дамоў. Пасля школьнікі падрабязна пазнаёміліся з экспазіцыяй на афганскую тэму, створанай у музеі.

### «Нельга прывыкнуць да смерці»

Найбольш сённяшніх дзяцей захапілі аповеды непасрэдных удзельнікаў тых падзей. Уладзімір Кутас і Генадзь Грыцкевіч былі ў Афганістане ў розны час, займалі там розныя пасады, аднак, калі пабач гінулі людзі, ім абодвум было аднолькава страшна.


Воін-інтэрнацыяналіст Уладзімір КУТАС.

Уладзімір Кутас трапіў у Афганістан у 1981 годзе кадравым вайскоўцам. Пасля заканчэння школы ён, ураджэнец Стаўбцоўскага раёна, скончыў Ленінградскае артылерыйскае ваеннае вучылішча. Пасля службы ў Туркестанскай ваеннай акрузе, у Ашхабадзе. У Афганістан папрасіўся сам.

— Толькі выйшлі з самалёта ў Кабуле, як нас пачало здуваць ветрам, які мясцовыя жыхары назвалі «афганцам», — успамінае Уладзімір Антонавіч. — Клімат там вельмі дрэнны. Наша падраздзяленне знаходзілася на вышыні 1,5 тысячы кіламетраў над узроўнем мора. Практычна горная мясцовасць, але, пачынаючы ўжо з канца студзеня, паветра награвалася да 25—30 градусаў, летам даходзіла да 55 градусаў цяпла.

Па першым часе вайсковае падраздзяленне, якім камандаваў капітан Кутас, устанаўлівала ў Афганістане дызельныя электрастанцыі, будавала першую ў краіне чыгунку, ахоўвала дарогі, вялікія прадпрыемствы. Затым пачаліся сур'ёзныя баявыя дзеянні. «Аналізуючы мінулыя падзеі, сёння з упэўненасцю можна сказаць, што за гэтыя 10 гадоў, якія ў Афганістане знаходзіліся савецкія войскі, мы там больш будавалі, чым знішчалі, — перакананы воін-інтэрнацыяналіст. — Дагэтуль жыхары Афганістана, якія памятаюць нас, параўноўваючы савецкія войскі з амерыканскімі, кажуць, што гэта неба і зямля. За апошнія гады амерыканцы зноў зрабілі гэтую краіну нарказалежнай, паток наркотыкаў адтуль павялічыўся ў дзясяткі разоў».

Уладзімір Кутас дагэтуль памятае, як па-добраму да іх ставіліся мясцовыя жыхары. Калі савецкім ваеннаслужачым патрэбна было пагутарыць з імі, прасілі дапамогі ў дзяцей. Крыху больш чым год прайшоў пасля таго, як савецкія войскі ўвайшлі ў Афганістан, а маленькія мясцовыя жыхары выдатна валодалі рускай мовай.

Рознае было ў тыя два з паловай года, пакуль Уладзімір Антонавіч знаходзіўся ў Афганістане. Аднак нашы людзі прывыкалі да многага: да спёкі, шматлікіх абмежаванняў, недахопу ежы, стральбы... Адзінае, да чаго немагчыма было прывыкнуць, — гэта гібель саслужыўцаў. «За час майго знаходжання на чужыне я страціў чацвярых сваіх падначаленых, — расказвае ветэран вайны ў Афганістане. — Старшы афіцэр батарэі, ленінградзец, добрым хлопцам быў. Акурат прыехаў з адпачынку. Шчаслівы такі: сказаў, што хутка жэніцца. Праз два месяцы яго не стала...»

Як дбайны гаспадар, Уладзімір Кутас клапаціўся пра тое, каб яго салдаты не галадалі. Памятае, як ездзіў атрымліваць на ўвесь дывізіён бульбу, як грузіў усе 29 тон у невялікія машыны. «Аднойчы падчас баявой аперацыі пад абстрэл трапіла карова, — расказвае воін-інтэрнацыяналіст. — Не прападаць жа дабру. Стала пытанне: як захаваць? Мяса шмат, а спёка якая! Палову мяса завэндзілі, другую — схавалі ў склепе, які выкапалі. Потым свежае мяса елі доўга».

За свае дзеянні ў Афганістане Уладзімір Кутас быў прадстаўлены да медаля «За адвагу». Аднак узнагароду так і не атрымаў. Спачатку медаль быў страчаны, затым перашкодзіў развал Савецкага Саюза. Аднак тое, як лічыць былы вайсковец, сёння ўжо не мае значэння. «Важна ўмець абараняць сваю краіну — гэта запісана і ў нашай Канстытуцыі, — кажа ён, звяртаючыся да вучняў Маякскай школы. — Гэта святы абавязак кожнага мужчыны, ад якога не трэба ўхіляцца».

### «Падмена прыйшла нечакана»

Генадзь Грыцкевіч родам са Слуцкага раёна. Толькі ён скончыў вучылішча, як прыйшла павестка ў армію. Пра Афганістан там не было ні слова, хоць многія ведалі, што там ідзе вайна, на якую адпраўляюць нашых хлопцаў.

— Селі ў вагоны, сказалі, што едзем служыць у Германію, — успамінае Генадзь Грыцкевіч. — Дзень едзем, два, тры — глядзім, а за акном вярблюды ходзяць! Стала зразумела, дзе мы будзем знаходзіцца найбліжэйшыя два гады.

У Афганістане воін-інтэрнацыяналіст быў артылерыстам-наводчыкам, заўсёды на перадавой. Справа вельмі небяспечная: неабходна беспамылкова вызначыць адлегласць да цэлі, дакладна навесці на яе прылады, правесці агонь. Артылерысты суправаджалі калоны з людзьмі і тэхнікай, падтрымлівалі пехацінцаў.

— Калі пайшлі на першае заданне, узялі з сабой дваіх праваднікоў, якія нас прывялі ў засаду, — кажа ўдзельнік тых падзей. — Тады я ўпершыню ўбачыў, як гінуць людзі... Потым смерці былі адна за другой. Пасля баёў мы павінны былі даставіць целы ў падраздзяленне, каб на радзіме чалавека маглі пахаваць. Нельга было дапусціць, каб забіты знаходзіўся на тэрыторыі душманаў. Гэта было самае горшае, бо з трупамі савецкіх салдат чынілі здзекі.

Для Генадзя Грыцкевіча вайна ў Афганістане скончылася ў лютым 1985 года. Прабыў там больш за два гады. Ніхто не ведаў, калі прыйдзе падмена, і яны змогуць вярнуцца на радзіму. Такая навіна была заўсёды нечаканай і радаснай для кожнага. Дадому воін-інтэрнацыяналіст вярнуўся з медалём «За баявыя заслугі», якім яго ўзнагародзілі за добрасумленную службу.

**Вераніка КАНЮТА, фота аўтара.**
*Слуцкі раён.*

Педсавет

# ГІД ПА СВЕЦЕ САПРАЎДНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

**Кожны юнак ведае, што аднойчы прыйдзе той момант, калі неабходна будзе з'явіцца ў ваенкамат, а магчымасць накіравацца на службу ў войска з далёкай перспектывы можа ператварыцца ў хуткую рэальнасць. Веданне гэтага факта не змяншае стрэс, які перажывае будучы прызыўнік. У Гомельскай сярэдняй школе № 59 з уручэння павестак у ваенкамат старшакласнікам змаглі зрабіць запамінальнае свята. Яно дапамагае юнакам адчуць гонар за магчымасць прайсці «школу мужнасці».**


Кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання СШ № 59 г. Гомеля Дзмітрый УКЛЕЙКА праводзіць урокі мужнасці.

Імкненне да цікавага, нефармальнага падыходу ў выхаванні патрыятычнай свядомасці вучняў — заслуга кіраўніка ваенна-патрыятычнага выхавання Гомельскай СШ № 59 Дзмітрыя Уклейкі. Сапраўдны падпалкоўнік у школе — «малады спецыяліст» — працуе з пачатку бягучага вучэбнага года. Па асноўнай спецыяльнасці Дзмітрый Мікалаевіч — афіцэр кіравання падраздзяленнямі пагранічнай службы. Ёй і аддаў 20 гадоў жыцця. Падчас вучобы ў ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь атрымаў дыплом сацыяльнага педагога-псіхолага. Можа, таму прафесійны ваенны так хутка і асвоіўся ў школьным навучальным працэсе. Яго пазакласныя ўрокі дадатковыя, але вельмі папулярныя сярод вучняў усіх класаў.

— Калі ў 2000 годзе атрымліваў дыплом, падумаў: на пенсію выйду — у школу пайду працаваць. Як у ваду глядзеў. Усе веды спатрэбіліся. Я ж на розных камандзірскіх пасадах заўсёды вучыў салдат. Быў нават старшым выкладчыкам кіналагічнага цэнтра — рыхтаваў праправшчыкаў да работы са службовымі сабакамі. Калі салдат вучыш, валодаеш методыкай выкладання. Мне казалі так: вучы салдат таму, што патрэбна на вайне. Цяпер таксама ідзе вайна — інфармацыйная. Таму і дзяцей трэба вучыць арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, — дзеліцца Дзмітрый Уклейка.

Па яго словах, у вялізным інфармацыйным патоку не тое што дзеці — дарослыя не здольны сарыентавацца. Многія падлеткі жывуць у віртуальным свеце анімэ ці камп'ютарных гульняў. Кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання на сваіх занятках можа навучыць дзяцей думаць лагічна, супастаўляць падзеі, якія былі ў мінулым і адбываюцца сёння вакол нас.

Між тым для правядзення пазакласных урокаў па ваенна-патрыятычным выхаванні ў гэтай гомельскай школе спецыяльна абсталявалі кабінет. Зрабілі новы, вельмі цікава інфармацыйна скампанаваны стэнд з партрэтамі і кароткай інфармацыяй пра піянераў-герояў. Дарэчы, на тым жа стэндзе знайшлося месца і для фотаздымка Ромы Кагатоўскага, і інфармацыі пра нашага сучасніка, які вынес з палаючага дома свайго маленькага брацікa. Ёсць тут і інфармацыйная старонка, якую час ад часу абнаўляюць самі школьнікі. Яны знаходзяць звесткі пра сваякоў, якія ваявалі, і такім чынам расказваюць пра іх іншым навучэнцам.

Сам жа кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання кажа, што цяпер заняты падборам сучаснай фільматэкі пра вайну, якую можна было б выкарыстоўваць на ўроках патрыятычнага выхавання.

Акрамя таго, сёння па ініцыятыве Дзмітрыя Уклейкі сярэдняя школа № 59 пакуль адзіная ў Гомелі далучылася да новага выхаваўчага праекта «Кінаўрокі ў школах міру».

— На занятках вучні праглядаюць кароткаметражныя фільмы, у якіх ставіцца якаянебудзь маральна-этычная праблема, — тлумачыць ваенрук. — Пасля прагляду мы разам абмяркоўваем фільм і ставім мэту — зрабіць нейкую добрую справу. Нядаўна мы з нашымі вучнямі, напрыклад, зрабілі паштоўкі са словамі падзякі школьным прыбіральшчыцам, кухарам — супрацоўнікам школы, ад працы якіх шмат залежыць, але пра якіх заўсёды неяк забываюць. Самая апошняя наша новая карысная актыўнасць — гэта калі дзецям даецца заданне дапамагаць па гаспадарцы бацькам і рабіць відэасправаздачы. Потым мы гэта манціруем разам, арганізоўваем прагляд ролікаў у розных класах, каб дзеці маглі браць прыклад адзін з аднаго.

Дзмітрый Мікалаевіч упэўнены, што выхаванне патрыятызму і пачынаецца з невялікіх простых добрых спраў, якія трэба рабіць пастаянна:

— Дзецям важна разабрацца ў сапраўдных каштоўнасцях. Звычайных байцам бы: чаму трэба паважаць старшых, як адрозніць дабро ад зла. Ім трэба ведаць, што такое любоў, у тым ліку да Радзімы. Урэшце, цаніць тое, што ёсць цяпер у іх жыцці. Калі чалавек можа гэта адчуваць і разумець, тады ён здольны здзейсніць подзвіг. Нам пра вайну расказвалі людзі, якія ведалі ўсё на сваім вопыце. У мяне, напрыклад, дзед ваяваў, а бабуля пякла хлеб для партызан. Цяпер жа пра вайну могуць расказваць гісторыкі, якія атрымалі адукацыю за мяжой. Інфармацыя ад іх сумнiўная, яны ўжо спрабуюць ўвогуле перапісаць гісторыю, памяняць арыенціры ў грамадстве.

Кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання з горыччу адзначае: на жаль, бацькі яго вучняў мала што ведаюць пра геpаічныя ваенныя подзвігі продкаў, таму і дзецям нічога не могуць расказаць. У яшчэ толькі пачынаючага настаўніка, вядома, ёсць сумненні: ці здолее ён паўплываць на гэту сітуацыю. Кажа, навучыць хоць бы аднаго школьніка ведаць і любіць сваю краіну, яе гісторыю, крытычна мысліць — для яго ўжо перамога.

— Калі я прыйшоў у школу — пачалося быццам новае жыццё. Я трапіў туды, дзе па-сапраўднаму патрэбны, — расказвае аб сваім стаўленні да новага жыццёвага вопыту Дзмітрый Уклейка. — Тут дзеткі з чыстымі вачыма слухаюць пра піянераў-герояў, і ім гэта цікава. Думаю, яны запомняць тое, што я ім расказваю, і бацькам сваім раскажуць. З дарослымі школьнікамі мы размаўляем па-даросламу. Кажу: «Вас ніхто жыццю так не навучыць, як трудавік і ваенрук». Пры гэтым прызнаюся: я спачатку думаў, што сённяшніх дзяцей вучаць так, як і нас некалі. Высветлілася, гэта зусім інакш. Служыць хлопцы не хочуць у арміі. Ім я паказваю відэа з ваенных устаноў вышэйшай адукацыі, расказваю пра перспектывы пасля заканчэння ваеннай ВНУ.

Як інфанагоду для сваіх заняткаў кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання выкарыстоўвае і важныя даты, гістарычныя і сучасныя падзеі, палітычную сітуацыю. Напрыклад, са старэйшымі дзецьмі, як і з настаўнікамі, цяпер у школе абмяркоўваюць змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ О АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** |
| Дата, время и место проведения аукциона | **16.03.2022, 12.00,** актовый зал ОАО «Солигорскторг» |
| **Лот № 1** | |
| Предмет аукциона | **Право заключения договора аренды недвижимого имущества – части изолированного помещения с инвентарным номером 644/D-30196** |
| Общая площадь, кв. м | 506,2 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 24 |
| Характеристика недвижимого имущества и иные сведения | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, погрузочно-разгрузочные рампы, подъездные пути |
| Условия аукциона | **Целевое использование имущества – для осуществления розничной торговли трикотажными изделиями белорусского производства** |
| Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб. | 2 138,70 |
| Сумма задатка, руб. | 213,00 |
| Срок договора аренды | 5 лет |
| Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем | 3 (три) |
| Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб. | 3 200,00 |

Порядок проведения аукциона и условия участия в аукционе определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в собственности ОАО «Солигорскторг», утвержденным решением наблюдательного совета (протокол № 3 от 12.04.2019).

1. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

1.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме;

1.2. копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица либо индивидуального предпринимателя;

1.3. *документ, подтверждающий внесение задатка на расчетный счет ОАО «Солигорскторг» (УНП 600122715) р/с BY91AKBB 30120128800126600000 в ЦБУ № 633 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Солигорск, ул. Козлова, 23 А, код BIC AKBBBY2X, с отметкой банка;*

1.4. лицо, желающее принять участие в аукционе, заключает с ОАО «Солигорскторг» соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме;

при подаче заявления и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом, индивидуальным предпринимателем – документ, удостоверяющий личность.

2. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

3. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан:

- подписать протокол аукциона в день его проведения;
- в течение 3 рабочих дней со дня его проведения перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение;
- подписать договор аренды недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

4. **Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, «Финансовый отдел» с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 11 марта 2022 г. включительно, телефоны: 8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автобус ГАЗ-3307 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 2 | Автомашина LADA 21144.110-32, инв. № 84 | 1 104,00 | 110,40 | 55,20 |
| 3 | Автомобиль грузовой бортовой MERCEDES-BENZ, инв. № 55 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 4 | Компрессор ЗИФ 55В б/у, инв. № 11 | 1 584,00 | 158,40 | 79,20 |
| 5 | Теплогенератор мобильный ЕС 55, Италия, инв. № 967 | 470,00 | 47,04 | 23,52 |
| 6 | Штукатурная станция, инв. №1437 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 7 | Штукатурная станция ШС-4/6, инв. №250 | 1 488,00 | 148,80 | 74,40 |
| 8 | 1. Бур почвенный Д 250 мм; 2. Мотобур ВТ 360 | 1 297,80 | 129,78 | 64,89 |
| 9 | Автомобиль «КИА СПОРТЕЙДЖ», инв. № 40 | 18 468,00 | 1 846,80 | 923,40 |
| 10 | Электроприборы согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/1-ktY5fvc7qvUNKEiqc6BU8_hhrqjAaYx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 458,76 | 45,88 | 22,94 |
| 11 | Болты, гвозди, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1v7-_N-KXSvkLCUZxZV1-QBPeNtYV3XyF/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 171,53 | 17,15 | 8,58 |
| 12 | Инструменты согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1dxu0iJ4qBlcGCc6Uqebv7OJle2KAOb9Q/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 10 492,34 | 1 049,23 | 524,62 |
| 13 | Строительные материалы/приборы согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/1Lezhcv2cNhRWxyWIiYT88Iftrs7nxXDk/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 11 535,75 | 1 153,58 | 576,79 |
| 14 | Одежда согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1wk5Q3FMiaUS_WRlq09cng-2aNxxLZOtz/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2 889,47 | 288,95 | 144,47 |
| 15 | Сваи согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1wIjTWIZBCrzgp5iVslwvFnTiahoOO8QZ/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1 416,00 | 141,60 | 70,80 |

В отношении Лота 1 проводятся шестые повторные торги. В отношении лотов 2–7 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 13 (29635) от 21.01.2022, стр. 6, № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 228 (29597) от 25.11.2021, стр. 15, № 205 (29574) от 23.10.2021, стр. 13, № 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6, № 141 (29510) от 27.07.2021, стр. 6. В отношении Лота 8 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 13 (29635) от 21.01.2022, стр. 6, № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 228 (29597) от 25.11.2021, стр. 15, № 212 (29581) от 03.11.2021, стр. 15, № 190 (29559) от 02.10.2021, стр. 15, по лоту 19.2 (Мотобур ВТ 360) – 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6. В отношении лота № 9 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 205 (29574) от 23.10.2021, стр. 13. В отношении лотов №№ 10–15 проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | По лотам 1–9: **28 февраля 2022 года в 14.00 (регистрация с 15.30 до 15.55)** По лотам 10–15: **21 марта 2022 года в 14.00 (регистрация с 15.30 до 15.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | По лотам 1–9: **с 10.00 15.02.2022 по 16.00 24.02.2022** По лотам 10–15: **с 10.00 15.02.2022 по 16.00 17.03.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых ___.___.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста: 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Александру Владимировичу (+375293697036).** По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру (+375 (29) 339-68-45).

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества УГП «Трест «Гродногорстрой» (УНП 500110650), объявляет о проведении **01.03.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/02/spisok-imushhestva-grodnogorstroj.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 (29) 866-10-00, Наталья Николаевна.

**Продавец:** УГП «Трест «Гродногорстрой».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **28.02.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **15.02.22** по 17.00 **28.02.22** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб.; по лоту № 1 – 8296,54 бел. руб., по лоту № 2 – 584,10 бел. руб.; аукционный сбор: по лоту № 1 составляет 0,5 % от цены реализации предмета торгов; по лоту № 2 – 2 % от цены реализации предмета торгов.

**Срок подписания договора купли-продажи:** в течение пятнадцати рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Срок оплаты по договору купли-продажи:** победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить 20 % от стоимости предмета торгов в соответствии с договором купли-продажи не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, 80 % стоимости предмета торгов оплачиваются ежемесячно до 25-го числа текущего месяца равными долями в течение 10 (десяти) месяцев со дня проведения торгов.

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ПромМаркетинг»

(УНП 192484680, Минская обл., Минский р-н, аг. Острошицкий Городок, ул. Ленина, д. 1-3, каб. 3-1-73),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов:*** **02 марта 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 15 февраля 2022 года по 28 февраля 2022 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:*** **ООО «ПромМаркетинг» (УНП 192484680)** в лице антикризисного управляющего – директора общества с ограниченной ответственностью «Деловой консалтинговый центр» Поповой Е.А, тел. 8 (029) 243-71-37.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Система видеонаблюдения, б/у | 162,00 | 5 % | 5 % |
| 2 | Воздухонагреватель Energylogik EL 340H-S | 3 051,00 | 5 % | 5 % |
| 3 | Установка лазерной резки с ЧПУ Platino 1530 HS-3500 | 76 050,00 | 5 % | 5 % |
| 4 | Сварочный полуавтомат Aristo 500 | 3 420,00 | 5 % | 5 % |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **28 февраля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 28.02.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случаях, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

*РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 243 (29612) за 16.12.2021.*

Ваша права

# АЛЬТЭРНАТЫВА ПАЗБАЎЛЕННЮ ВОЛІ І КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ СКАРГА

## Валерый Калінковіч: «Грамадства зацікаўленае, каб у любой сітуацыі судовая ўлада працавала стабільна»



**Леташнія змяненні ў Адміністрацыйны і Крымінальны кодэксы краіны зрабілі іх больш гуманнымі. Новаўвядзенні даюць больш магчымасцяў для альтэрнатыўных мер адказнасці, якія не звязаныя з пазбаўленнем волі і ўвогуле з прымяненнем крымінальнага пакарання. А меркаваныя змяненні, датычныя магчымасці звяртацца для перагляду справы ў Канстытуцыйны суд, стануць дадатковым стымулам для судоў агульнай юрысдыкцыі больш дбайна працаваць з заканадаўствам, на падставе якога разглядаюцца справы, лічыць Валерый КАЛІНКОВІЧ, першы намеснік старшыні Вярхоўнага суда. Пра ўдасканаленне парадку абскарджвання судовых рашэнняў, каб кожны мог звярнуцца па абарону сваіх парушаных правоў, ішла гаворка і на нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, дзе ён падкрэсліў, што магчымасць выправіць судовыя памылкі павінна быць безумоўна гарантавана чалавеку, а судаводства мусіць быць максімальна справядлівым. Для гэтага мяркуецца распаўсюдзіць дзеянне інстытута апеляцыі на ўсе судовыя рашэнні, у тым ліку на рашэнні Вярхоўнага суда (цяпер яны не падлягаюць абскарджванню). Дарэчы, у склад апеляцыйнай калегіі, магчыма, змогуць увайсці не толькі суддзі, але і прадстаўнікі грамадскасці.**

### ДАКЛАДНЫ СЭНС ЗАКОНА

Чым больш альтэрнатыўных магчымасцяў пакаранню ў правасуддзя, тым менш асуджаных і менш асоб, якія прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці за несур'ёзныя правапарушэнні. І хоць у 2020-м колькасць адміністрацыйных спраў значна ўзрасла, у 2021-м назіралася адваротная тэндэнцыя. Што датычыцца павелічэння жорсткасці ў пакараннях, то яны ў законе сталіся кропкавымі, а асноўная маса паправак была скіравана ўсё ж не на лібералізацыю, а на прадастаўленне магчымасці альтэрнатывы, запэўніў Валерый Калінковіч.

Права грамадзян непасрэдна звяртацца ў Канстытуцыйны суд (пры выкананні азначаных у Канстытуцыі ўмоў) прымусіць суды стаць больш дысцыплінаванымі. Прынамсі, выключыць выпадкі прыняцця рашэнняў, калі закон трактуецца не ў адпаведнасці з яго дакладным сэнсам. Існуе такая падстава для перагляду рашэння суда, калі ён у сваім рашэнні сказіў дакладны сэнс закона, канстатаваў Валерый Калінковіч.

— Гэта таксама стане яшчэ адной нагодай паляпшаць работу нашых судоў ва ўсіх формах і напрамках, таму што ўжо цяпер можна спрагназаваць: жадаючых звярнуцца ў Канстытуцыйны суд са скаргай можа быць дастаткова.

### АДПАВЕДНАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВА ПАКАРАННЮ

Прававая культура з часам павышаецца. Адна з нядаўніх навел — прадугледжанае за абразу гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі крымінальнае пакаранне.

— Гонар, годнасць і дзелавая рэпутацыя — аснова паняцця «статус асобы чалавека», які падлягае заканадаўчай абароне ўсімі сродкамі: адміністрацыйна- і крымінальна-прававымі, — падкрэсліў суразмоўнік. — Пад канстытуцыйную гарантыю таго ці іншага права механізм абароны павінен утрымлівацца ў заканадаўстве больш нізкіх узроўняў: кодэксах і законах.

Што датычыцца адпаведнасці пакарання здзейсненаму правапарушэнню ў многіх адміністрацыйных і крымінальных справах 2020—2021 гадоў, то заканадаўчая вілка адказнасці ўстанаўліваецца заканадаўцам зыходзячы з той ацэнкі парушэння закона, якая ім прадугледжана, акрэсліў Валерый Калінковіч:

— Калі гаворка пра крымінальнае злачынства, трэба глядзець, наколькі яно па сваім характары і наступствах небяспечнае як з'ява. Пакаранне за збыт наркотыкаў у нас часта параўноўваюць з адказнасцю за забойства. А што, збыт наркотыкаў, ад якіх можна памерці, — не забойства? Забойства, проста ў растэрміноўку. Сацыяльныя наступствы ад абедзвюх з'яў суразмерныя. Крымінальна-прававая санкцыя ўстанаўліваецца ў залежнасці ад сацыяльных наступстваў і небяспекі самога правапарушэння. А вось гранічныя межы ўнутры санкцыі (умоўна, ад трох да дзесяці гадоў) вызначаюцца пры разглядзе канкрэтнай справы, калі ёсць канкрэтны злачынца, канкрэтныя абставіны здзяйснення. І ўжо справа суда — разабрацца ўнутры гэтай санкцыі і вызначыць меру адказнасці, якая павінна прымяняцца да чалавека ў канкрэтнай справе, прымяніць санкцыю так, каб было справядліва.

Пры пакараннях за антыграмадскі настрой жартаваць не варта, асабліва калі паглядзець на тое, што адбылося ва Украіне і ледзьве не здарылася ў Казахстане. Неабходна займаць жорсткую пазіцыю, адклаўшы ў бок сантыменты, калі гаворка ідзе пра пакаранне за дзеянні падобнага кшталту.

— Антыграмадскія праявы, які могуць нанесці сур'ёзны ўрон, павінны адпаведным чынам перапыняцца. Іншага шляху няма. У нас ёсць розныя меры пакарання, а ўжо якая кара будзе прызначана канкрэтнаму чалавеку, — вызначаецца прысудам суда, у залежнасці ад таго, хто на што «напрацаваў».

Такім чынам здзяйсняецца агульнапапераджальная функцыя крымінальнага закона.

**Ірына СІДАРОК.**

Праблема

# ЗУБР МЯЖЫ НЕ ПРЫЗНАЕ

## Вучоныя і эколагі Брэстчыны выступілі супраць будаўніцтва агароджы праз Белавежскую пушчу

**У Палескім аграрна-экалагічным інстытуце адбыўся круглы стол на тэму ўзвядзення загараджальнага пагранічнага збудавання ў Белавежскай пушчы на тэрыторыі Польшчы. Удзельнікі нарады заклікалі спыніць будаўніцтва аб'екта на карысць адзінай у Еўропе ўнікальнай сусветнай спадчыны такога кшталту.**

Будаўніцтва пагранічнай агароджы пачалося нядаўна. Польскі бок тлумачыць гэта леташнім міграцыйным крызісам, калі тысячы людзей з Блізкага Усходу спрабавалі трапіць у Еўрасаюз, каб атрымаць статус бежанца. Агароджа бачыцца суседзям як засцярога ад нелегальнай міграцыі. Па сутнасці ж гэта сцяна вышынёй 5,5 метра, даўжынёй 180 кіламетраў, з якіх 60 пройдзе па тэрыторыі Белавежскай пушчы. Нехта ўжо параўнаў новае інжынернае збудаванне з Берлінскай сцяной. І нездарма рашэнне выклікала трывогу вучоных па абодва бакі граніцы.

— Белавежская пушча — гэта агульнаеўрапейскі і сусветны набытак, — сказаў **кандыдат біялагічных навук, дырэктар Палескага аграрна-экалагічнага інстытута НАН Беларусі Мікалай МІХАЛЬЧУК**. — На ўсіх узроўнях навуковай супольнасці ёсць дакладнае разуменне непадзельнасці прыроднай сістэмы пушчы. Мы вымушаныя лічыцца з адміністрацыйным дзяленнем, з палітычнымі граніцамі, якія склаліся ў гэтай частцы Еўропы. Але ж прырода, фізіка-геаграфічная прастора не мае граніц, з гэтым трэба лічыцца і палітыкам, і дзяржаўным дзеячам.

Еўрапейская экалагічная грамадскасць выказала заклапочанасць з такой нагоды. Некалькі соцень аўтарытэтных навукоўцаў і экологаў звярнулася ў Еўракамісію з просьбай прыпыніць будаўніцтва агароджы. Сцяна можа парушыць магчымасць для абмену генетычнай інфармацыяй, што пацягне за сабой пагаршэнне захаванасці відаў жывёльнага свету. Паводле думкі Мікалая Міхальчука, вучоныя ўсяго свету павінны выкарыстаць увесь свой аўтарытэт, каб сказаць важкае слова дзеля аховы пушчы, аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Гэты векавы лес мае запаведны статус больш за 600 гадоў. Пушчу заўсёды ахоўвалі ўсе дзяржавы, у якія яна ўваходзіла праз усю гісторыю. Таму і сёння мы не маем права ёй нашкодзіць, мы ў адказе за яе перад нашчадкамі, лічыць **дырэктар Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Аляксандр БУРЫ**. А будаўніцтва агароджы ён назваў недарэчнай памылкай, яно не ўзгодненае з навуковай супольнасцю.

— Мы вядзём перагаворы з польскімі калегамі, кіраўнікамі парку, — працягнуў Аляксандр Васільевіч. — Яны таксама катэгарычна супраць узвядзення агароджы. Ужо сёння мы адчуваем наступствы першых крокаў такіх дзеянняў. Некаторыя жывёлы пацярпелі, атрымалі траўмы і стрэс. Па дамоўленасці з пагранічнымі службамі мы падкормліваем жывёл, якія трапілі ў гэты пагранічны пенал, будзем падкормліваць звяроў і далей, пакуль не будуць прынятыя дзейсныя меры.

**Загадчык лабараторыі аграрна-экалагічнага інстытута**, вядомы на Брэстчыне **вучоны-эколаг Віктар ДЗЯМЯНЧЫК** падкрэсліў, што з беларускай пагранічнай службай вучоныя працуюць даўно:

— Як вядома, з нашага боку па лініі граніцы заўсёды была загараджальная сетка. Але сетка — гэта не катастрафічны бар'ер для міграцыі жывёл. Напрыклад, дзік, калі ён у спецыфічны перыяд пачуе сяброўку на польскай тэрыторыі, ці наадварот, то прэ напралом. Вялікі і дужы, ён проста прабівае гэтую металічную сетку без асаблівага ўрону для сябе. І ўжо тады вартавым граніцы даводзіцца перыядычна латаць тую сетку. Грацыёзныя казулі кладуцца і праціскаюцца знізу, гэтак жа робяць іншыя дробныя жывёлы.

А вось гэтая стальная «спіраль Бруна», якую ставяць цяпер, не пакідае шанцаў для прадстаўніка фаўны любога памеру. Ён калі і не загіне, то вельмі моцна траўміруецца, атрымае стрэс. І гэта парушэнне ўсіх магчымых міжнародных канвенцый наконт жывёльнага свету.



У многіх краінах Еўропы, пры ўстанаўленні неадпаведнасці пасткі стандартам, напрыклад, калі мыш у ёй будзе мучыцца пяць секундаў замест рэгламентаванай паўсекунды, вытворца пастак можа панесці сур'ёзную адказнасць. А тут гаворка ідзе пра пакуты і магчымую гібель зуброў, ласёў, аленяў, ваўкоў, рысяў. І гэта ўжо вялікая праблема. Паводле Віктара Дзямянчыка, прыдумана шмат спосабаў кантролю перамяшчэння жывых істот, ёсць розныя ўльтрагукавыя датчыкі, разнастайныя цеплавізары, камеры відэаназірання. Вось такая апаратура і можа быць прымененая ў святым для экалогіі рэгіёне для папярэджання любых незаконных дзеянняў, але ніяк не сцяна.

Акрамя таго, пры будаўніцтве падобнага аб'екта выкарыстоўваецца цяжкая тэхніка, што не можа не паўплываць на агульную прыродную карціну лясного масіву. Да таго ж ніхто не дасць гарантыю, што ў выніку не адбудзецца змяненне ўзроўню грунтавых водаў. А змены ў гідралагічным рэжыме могуць прывесці да страты асобных балот з негатыўнымі наступствамі для флоры і фаўны.

Віктар Дзямянчык лічыць неабходным тэрмінова правесці сумесны форум беларускім і польскім вучоным, каб выказаць агульную пазіцыю па дадзеным пытанні. Гаворка ідзе пра лёс адзінага ўнікальнага ляснога масіву на прасторы ад Балтыйскага да Чорнага мора.

**Намеснік старшыні Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ПЯЧКО** мяркуе, што намаганняў навукоўцаў у гэтай сітуацыі недастаткова. Трэба, каб за стол перагавораў селі прадстаўнікі ўрадаў краін і прынялі рашэнне. Грошы, якія запланавана затраціць на загароду, лепш было б накіраваць на далейшае вывучэнне і захаванне ўнікальнага прыроднага ландшафту.

Шкада, што людзі сваімі безадказнымі дзеяннямі падстаўляюць пад удар ні ў чым не вінаватых жывёл, мірных насельнікаў пушчы. Зубру ж не раскажаш пра крызіс у палітыцы, пра граніцы і абмежаванні. Ён прывык адчуваць сябе ўладаром пушчы — і застанецца ім, нават калі гэта будзе каштаваць яму жыцця. Меншыя звяркі, можа, і знойдуць нейкае выйсце, напрыклад, прарыюць норы, а волату патрэбная пастаянная «дарога жыцця», каб ён мог знаходзіць сяброўку не з блізкай радні і тым самым падтрымліваць свой зубрыны род у добрым здароўі, здольным несці якасную генетычную інфармацыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

# «РАБОТА Ў КУЛЬТУРЫ — ТАКСАМА ВЫТВОРЧАСЦЬ, ЯК БЫ ГРУБА ГЭТА НІ ГУЧАЛА»

## Інтэрв'ю з рэктарам БДУКМ Наталляй КАРЧЭЎСКАЙ

**На пачатку студзеня Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі і рэалізацыю грамадска-культурных праектаў. «Звязда» сустрэлася з рэктарам універсітэта. Падчас размовы Наталля Карчэўская распавяла аб дасягненнях навучальнай установы, уласным таймменеджменце і ўспамінах дзяцінства. Больш падрабязна — у нашым матэрыяле.**



Фота Аліны МАЗАВЕЦ

***— Якую ролю адыгрывае культура ў выхаванні патрыятызму і як сярод навучэнцаў творчых спецыяльнасцяў пазбегнуць фармалізацыі гэтага паняцця?***

— Працэс не выбудоўваецца адным рэктарам. Кожны выкладчык імкнецца зрабіць так, каб сапраўды не ўпасці ў лозунгі. Найлепш пачуццё патрыятызму ў студэнтаў выхоўваецца дзякуючы ўласнаму прыкладу педагогаў. Добра, калі моладзь бачыць, што ў яе выкладаюць людзі, якія зрабілі шмат для краіны і працягваюць працаваць на карысць беларускай культуры. Таксама трэба на прыкладах іншых краін тлумачыць студэнтам, што, скарыстаўшыся замежным вопытам, можна ва ўласным кантэксце стварыць і развіць нават нешта лепшае. Але вельмі неэфектыўны шлях — казаць навучэнцу, што, вось, недзе добра, а тут усё не так. Маладыя павінны разумець, што ніхто не прыляціць у блакітным верталёце і не створыць жыццё, якое малюецца глянцавымі часопісамі. Гэта штодзённая праца кожнага. У нас сапраўды шмат тых, хто любіць сваю радзіму, хоць не крычыць аб гэтым пры кожным куце. І калі студэнт усведамляе, ён непазбежна сам прасякаецца пачуццём шчырай, лагоднай любові да сваёй краіны.

***— Вы адзначалі, што адукацыя ва ўніверсітэце культуры практыкаарыентаваная. Калі ласка, прывядзіце прыклады, як студэнты сумяшчаюць тэорыю з практычнай дзейнасцю?***

— Гэта праяўляецца на розных узроўнях. Першапачаткова пры фарміраванні вучэбнай праграмы мы арыентуемся на тое, што будзе запатрабавана ў прафесійнай дзейнасці. Дзеці, якія потым стануць спецыялістамі, павінны прыўносіць новыя ідэі, а не карыстацца састарэлымі ўзорамі.

Акрамя таго, наша сувязь з прадпрыемствам ажыццяўляецца дзякуючы прыцягненню спецыялістаў з вядучых устаноў культуры. Хтосьці з іх працуе ў якасці выкладчыка-сумяшчальніка, хтосьці вядзе асобныя курсы. У нас дастаткова разгалінаваная сетка філіялаў кафедр — гэта значыць, частка заняткаў праходзіць на базах, дзе ёсць выдатныя дасягненні. Напрыклад, не так даўно адкрыўся новы корпус музейнага квартала, які валодае выдатнымі магчымасцямі з пункту гледжання рэстаўрацыйных майстэрань. Універсітэт плануе падпісанне дагавора з Нацыянальным мастацкім музеем менавіта для таго, каб адкрыць там філіял кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дарэчы, у нас шмат дагавораў аб супрацоўніцтве не толькі з мінскімі установамі культуры, але і з рэгіянальнымі інстытуцыямі. Нярэдка студэнты накіроўваюцца туды для праходжання практыкі.

Імкнёмся рэалізоўваць і творчыя праекты ўнутры сцен універсітэта. Падчас іх навучэнцы могуць паспрабаваць сябе не толькі ў якасці артыстаў, але і рэжысёраў, асістэнтаў, прадзюсараў. Гэта цэлы комплекс мерапрыемстваў, на якія запрашаюцца прадстаўнікі культурных устаноў. Мы заўсёды адкрыты для таго, каб на нашы паказы прыходзіла публіка. Артысты растуць на сцэне — атрымаць водгук заўсёды карысна.

***— Вы ўжо крыху закранулі тэму рэгіёнаў нашай краіны. Наколькі шмат ва ўніверсітэце вучыцца студэнтаў адтуль? Ці прасочваецца ў іх творчасці мясцовы каларыт?***

— Моладзі з рэгіёнаў паступае да нас даволі шмат. Год на год не прыходзіцца, але гэта заўсёды больш за палову ад агульнай колькасці навучэнцаў. Ёсць спецыяльнасці, на якіх увогуле няма мінчан. Канешне, студэнты прыўносяць нешта сваё. Абітурыенты, якія паступаюць ва ўніверсітэт культуры пасля каледжаў, безумоўна, нясуць пячатку таго, чаму навучылі педагогі іх сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы. Мы ў гэтым сэнсе ім вельмі ўдзячныя. Відаць, як складваюцца мастацкія школы, напрыклад, у Гомелі або ў Пінску, Гродне, Магілёве, Віцебску. Нават на ўзроўні традыцый, характэрных для таго ці іншага рэгіёна, можна заўважыць розніцу, напрыклад, у абрадах і іх назвах. Імкнёмся, каб моладзь захавала ўласную ўнікальнасць.

***— Вы педагог і выкладчык творчай ВНУ. Наталля Уладзіміраўна, як лічыце, дзе праходзіць мяжа паміж канструктыўнай і дэструктыўнай крытыкай? Як падчас навучання не разбурыць веру студэнта ў свае сілы?***

— Гэта вельмі цікавая тэма. І я не ўпэўнена, што магу быць прыкладам. Таму што кожны можа памыляцца. Здараліся такія выпадкі, калі здавалася, што ў чалавека нічога не атрымаецца, а ў выніку ўсё было добра. Але я заўсёды за тое, каб пачакаць — не сячы з-за пляча. Я магу падказаць, але дзейнічаю толькі па запыце. Калі пытаюцца, магу даць параду. Але сама вызначаць нечы лёс не бяруся, цягну да апошняга, пакуль ужо не стане відавочным, што ў чалавека ну зусім не атрымліваецца.

У мяне быў студэнт, аб якім усе выкладчыкі казалі — трэба адлічыць. Я ім кажу: «Ну, пачакайце, ён хоча вучыцца, заняткі не прапускае. Вам лягчэй будзе ад таго, што яго тут не стане?» І ўсё атрымалася — зараз працуе па спецыяльнасці і мае аўтарытэт. Я не вельмі веру ў выраз «магчымасці чалавека не абмежаваныя», але яны сапраўды не паддаюцца дакладнаму прагназаванню. Памыляюцца ўсе, нават самыя выдатныя педагогі. Таму я аддаю перавагу памылкам на карысць студэнта: лепш даць яму шанц, чым пазбавіць усіх магчымасцяў.

Канешне, часам трэба падказаць чалавеку, што яму лепш скарэкціраваць траекторыю развіцця, ісці ў сферу, дзе ён будзе больш паспяховы. Але стараюся не браць на сябе ролю суддзі.

***— Напэўна, у такіх выпадках падказвае інтуіцыя.***

— Так. Толькі нядаўна пачала разумець, наколькі складана педагогу часам сказаць нейкія словы. Банальны прыклад — што балерыне трэба схуднець. Трэба заўсёды памятаць, што педагог не здзекуецца. Ён думае аб тым, што побач з гэтай балерынай стаіць партнёр, які будзе яе падымаць, і пры горшым раскладзе танцор можа сарваць спіну, страціць прафесію. Я ўжо не кажу аб дзяўчыне, у якой «паляцяць» калені, ступні і гэтак далей.

Калі дзіцяці, асабліва падлетку, кажуць, што яму неабходна нешта ў сабе змяніць — гэта вельмі балюча. Таму трэба быць максімальна далікатным. Але пры гэтым не скочвацца ў слабасць. Гэта жорсткая прафесія. Работа ў культуры — таксама вытворчасць, як бы груба гэта ні гучала. Ты павінен разумець, што знаходзішся ў строгіх рамках.

***— Ваш універсітэт атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта. З аднаго боку, гэта вялікі гонар для супрацоўнікаў і студэнтаў, з іншага — высокая планка, якую неабходна трымаць. Якім чынам універсітэт плануе развівацца далей?***

— Мы заўсёды кажам: каб заставацца на месцы, трэба ісці, а каб рухацца наперад, трэба бегчы. Таму ўсе працэсы, якія развіваюцца ў сценах універсітэта, трэба зрабіць яшчэ больш інтэнсіўнымі. Часам я лаўлю сябе на думцы, што мяне многае задавальняе, але не падабаецца хуткасць рэалізацыі таго, што мы намецілі. Хацелася б выбудаваць працэс так, каб усе былі ў яго ўключаны. Наша мэта — захаваць усе напрамкі, якія ў нас ёсць. Мы не можам развіваць толькі адукацыйную частку, забываючыся аб выхаваўчай і навуковай. Трэба ўсім, хто тут працуе і вучыцца, даць максімум магчымасцяў для самарэалізацыі.

***— Наталля Уладзіміраўна, ці плануюцца новыя праекты?***

— Безумоўна. Калі гаворка ідзе аб творчых праектах, то вясной плануем выпусціць мюзікл, заснаваны на рэаліях нашага ўніверсітэта. Удзел у ім возьмуць беларускія і кітайскія студэнты. Спадзяёмся, што пры падтрымцы Міністэрства культуры зможам правесці Рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва. Фактычна штодзень узнікаюць праекты, якія рэалізоўваюцца на нашых творчых кафедрах: паставіць спектакль, арганізаваць канцэрт.

Нам вельмі хочацца, каб наш універсітэт выступаў у якасці творчага цэнтра, куды можа прыйсці кожны ахвотны і, засвоіўшы пэўныя курсы, атрымаць навык. Напрыклад, навучыцца прамоўніцкаму або мастакоўскаму майстэрству. Нашым кітайскім студэнтам, якія пераважна вучацца на спецыяльнасцях мастацтвазнаўства і культуралогіі, мы прапанавалі дадатковa пазаймацца харэаграфічным мастацтвам, музыкай. Мы не чакалі, што сярод іх гэта будзе настолькі запатрабавана.

***— Раскажыце, калі ласка, аб найбольш яскравым успаміне з дзяцінства, звязаным з мастацтвам.***

— Адразу скажу: гэта не балет. Нават і не ўспомню назву спектакля, але ён ішоў у тэатры імя Янкі Купалы. Уразіў нават не сам тэатр, а тое, як людзі пераўвасабляліся. Дарэчы, не раю з зусім ранняга дзяцінства прыводзіць дзяцей на сур'ёзныя, доўгія спектаклі.

Заўсёды ўражвала музыка. У дзіцячым садку нам уключалі класічную музыку. Паколькі я была дзіцем, то не заўсёды магла сказаць, ці гэта Бах, ці Моцарт, але адназначна творы Баха адклаліся ў маёй свядомасці. З таго часу ніколі не слухаю музыку для фону. Але ўсё роўна самае галоўнае ўражанне звязана з чытаннем, калі маці мне чытала казкі, якія здаваліся страшнымі.

Ніколі не прадбачыш, што спрацуе з канкрэтным дзіцем. Кагосьці ў тэатр водзяць з пялюшак, і дзіця, вырасшы, усё роўна нічога не разумее. Хтосьці пачынае хадзіць у сталым узросце і становіцца знаўцам мастацтва, шчыра яго любіць.

**Арына КАРПОВІЧ.**

***Больш падрабязна чытайце на сайце zviazda.by***

# ...БЕЗ ЛЕТУЦЕННІКАЎ ЗОРАМ ХАЛОДНА

## Агляды часопісаў: надрукавана ў «Маладосці»




**У студзеньскім, за 2022 год, нумары «Маладосці» ў жанры мастацкай прозы, паэзіі і публіцыстыкі прадстаўлена 12 аўтараў. Калі не лічыць добра вядомых чытачу Алены Брава, Міколы Маляўкі, Георгія Марчука, Ізяслава Катлярова, астатнія — моладзь. Праўда, і Маргарыта Латышкевіч сваімі вершамі і прозай таксама добра знаёмая чытачу, які сочыць за сучасным станам беларускай літаратуры. Які, на крайні выпадак, — чытае «Маладосць» на працягу апошніх гадоў.**

Раман Казлоўскі (нарадзіўся ў 1997 годзе ў Гродне) выступае з «рэфлексіяй пасля прачытання Васіля Быкава» «Застацца чалавекам». Канстанцін Дзіулія (нарадзіўся ў 1986 годзе ў Магілёве) знаёміць чытача з «палескім паланэзам» «Водар бэзу». Цікава, што рэдакцыя прадстаўляе аўтараў і іх творы яшчэ і каментарыямі. У Канстанціна Дзіуліі вылучана такое сведчанне: «У юнацтве чытаў мала, бо хацелася бегчы на вуліцу гуляць. Першая кніга, якую прачытаў усвядомлена, — пра Рабінзона Круза Даніэля Дэфо. У нашай сям'і заўсёды выпісвалі часопіс «Вясёлка». Падабалася перачытваць зборнік «Беларускія народныя казкі», асабліва казку «Ад крадзенага не пасыцееш». І цяпер перавагу аддаю творам павучальным». Яраслава Федчанка (нарадзілася ў Мінску ў 2002 годзе) выступае з падборкай вершаў «Думаў крылы». Гэта з яе верша без назвы: «Без летуценнікаў зорам халодна / і самотна на небе. / Днём і ноччу ніхто не ўзгадвае пра іх з захапленнем, / Не просіць у іх кропляў любові, цуду. / Яны дрыжаць, гатовыя ўпасці ў любую секунду. / Ды толькі гэтага ніхто не чакае...» У Андрэя Дзічэнкі (нарадзіўся ў Калінінградзе ў 1988 годзе) жанр твора «Чатыры кілаграмы бактэрый» вызначаны як апавяданне. І жанру твор адпавядае цалкам. Дарэчы, Андрэй Дзічэнка займаецца і драматургіяй. Піша ў асноўным на рускай мове. Кандыдат філалагічных навук Наталля Анапрэенка (нарадзілася ў 1975 годзе ў Мінску) прапануе чытачу чатыры вершы, аб'яднаныя ў падборку з агульнай назвай «Я — адвечны вандроўнік». Вольга Шпакоўская (нарадзілася ў Магілёве ў 1999 годзе) выступае з двума празаічнымі творамі — «За намі падглядае неба» і «Філасофская рыба».

Ад часопіса, па традыцыі, чытач чакае і твораў больш грунтоўнага аб'ёму, чым апавяданні, эсэ і вершы. І студзеньская «Маладосць» не падводзіць: прапануе гумарыстычную аповесць Андрэя Сідарэйкі (аўтар нарадзіўся ў 1985 годзе ў вёсцы Каравацічы Рэчыцкага раёна) «Непатрэбная рэч».

У студзеньскай «Маладосці» — успаміны Віктара Яраца пра Алеся Разанава («Шлях без адпачынку, або Нашчадак Праметэя»). Даволі цікавай падаецца гутарка з мастачкай Марынай Мароз («Паэзія ў адбітку гравюры»). На тэму «Развіццё сучаснага беларускага рамана» разважаюць празаік Валер Гапееў, празаік, публіцыст Юльяна Пятрэнка, публіцыст Канстанцін Касяк. Думкі розныя, часам супярэчлівыя нават у межах разважанняў аднаго ўдзельніка дыскусіі (не будзем у дадзеным выпадку акцэнтаваць, каму яны, гэтыя думкі, належаць): «Самы чытаемы літаратурны жанр у свеце — раман — безнадзейна састарэў»; «Насуперак даўнім разважанням літаратуразнаўцаў, у Беларусі і іншых краінах такі жанр, як раман, не зжыў сябе, ён развіваецца і працягвае прыносіць прыбытак выдавецтвам, ганарары аўтарам і задавальненне чытачам»; «...Праз самы кароткі час трыумфу «кароткай прозы» раман выйшаў да чытача жаданым госцем».

Нагадваем: цяпер выдаўцом часопіса Саюза пісьменнікаў Беларусі «Маладосць» з'яўляецца выдавецтва «Мастацкая літаратура».

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# АГУЛЬНАЯ МЛЯВАСЦЬ

## Спыталі ў нутрыцыёлага, як перамагчы «зімовую хандру»

**Устойлівы выраз «агульная млявасць і абыякавасць да жыцця» ідэальна апісвае звычайны для многіх людзей, якія пражываюць у нашай кліматычнай зоне, стан канца зімы — пачатку вясны. Сувязь паміж зніжэннем настрою, з'яўленнем апатыі і зменай сезонаў была апісана яшчэ ў пачатку 1980-х. У 1984 годзе пра яе ўпершыню загаварыў псіхолаг Норман Разенталь. З тых часоў мноства даследаванняў пацвердзіла ўзмацненне дэпрэсіўных станаў у мільёнаў людзей, якое ўзнікае ў пэўны адрэзак года (як правіла, у канцы зімы).**

Да нашых дзён у экспертаў няма вычарпальнага апісання механізмаў узнікнення так званай зімовай апатыі. Але навукоўцы кажуць аб тым, што наш эмацыянальны стан — гэта псіхафізіялагічны працэс: не толькі перажыванні, якія мы адчуваем у адказ на нейкую з'яву ці падзею, але і іх «фізіялагічны бок» — тое, што адбываецца ў арганізме ў гэты момант. І паколькі паўплываць на многія вонкавыя фактары (напрыклад, дадаць беларускай зіме сонечных дзянькоў) мы не ў стане, то, прынамсі, можам «падкарміць» арганізм вітамінамі або дадаць у рацыён прадукты харчавання, якія дапамогуць больш аптымістычна зірнуць на навакольную рэчаіснасць. Пра тое, як змяніць рацыён у канцы зімы — пачатку вясны, каб вярнуць добры настрой, мы спыталі ў **навуковага супрацоўніка аддзела харчавання Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні Ганны ЖУРНІ**.

> **«Прычынай недахопу энергіі часцей за ўсё служаць дэфіцыты вітамінаў і мінералаў, стрэсы і недахоп сну».**

### КАЛІ НЕ ХАПАЕ... ШЧАСЦЯ

***— Люты ў нашых шыротах — гэта авітаміноз і дэпрэсія. Адно вынікае з другога? Ці можна перамагчы дрэнны настрой пры дапамозе перагляду рацыёну?***

— Паміж авітамінозам і дэпрэсіяй, несумненна, ёсць сувязь. Але авітаміноз — гэта цяжкі стан, які ў цяперашні час у нашай краіне сустракаецца не так часта. Больш правільна будзе казаць пра сезонны гіпавітаміноз, які назіраецца зімой і вясной. Як правіла, пры збалансаваным і разнастайным харчаванні гіпавітамінозу атрымліваецца пазбегнуць. Аднак большасць насельніцтва нашай краіны ўсё ж мае дэфіцыт не толькі вітамінаў, але і мінералаў. Найбольш частыя парушэнні — гэта дэфіцыт вітамінаў групы B, D і C, з мінералаў — жалеза. Таксама наша паласа эндэмічная па дэфіцыце ёду.

Дэпрэсія часта звязана з недахопам сератаніну — так званага гармону шчасця, ён сінтэзуецца пад уздзеяннем ультрафіялетавых прамянёў. І прычынай зімовай дэпрэсіі найчасцей становіцца менавіта дэфіцыт сератаніну, што звязана з кароткім светлавым днём. Павялічыць колькасць сератаніну можна пры дапамозе прадуктаў харчавання, багатых на трыптафан — папярэднік сератаніну. Гэта яйкі, сыр і малочныя прадукты, ласось і іншая тлустая рыба, індычка і курыца, арэхі і семачкі, бабовыя, ананас і фінікі, а таксама какава і горкі шакалад.

***— Калі не хапае энергіі, відавочна, варта перагледзець рацыён, а таксама харчовыя звычкі. У сучасным уяўленні прадукты «для бадзёрасці» — гэта кава і шакалад. Ці могуць яны дапамагчы?***

— Прычынай недахопу энергіі часцей за ўсё служаць дэфіцыты вітамінаў і мінералаў, стрэсы і недахоп сну. Натуральна, усімі любімыя кава і шакалад могуць стаць толькі кароткачасовымі крыніцамі зараду бадзёрасці. Так, сапраўды, кава з'яўляецца псіхастымулятарам, яна дазваляе прачнуцца і зарадзіцца дозай энергіі, але не ліквідуе прычыну стомленасці. Шакалад спрыяе павышэнню дафаміну і глюкозы, што таксама дапаможа вам падсілкавацца, але гэта небяспечна тым, што ўзроўні дафаміну і глюкозы хутка падаюць, зноў з'яўляецца стомленасць, а ў далейшым — і залежнасць ад салодкага.

Пры з'яўленні дэфіцыту энергіі варта звярнуцца да спецыялістаў, бо адчуванне стомленасці — вынік не толькі дэфіцытаў мінералаў і вітамінаў, але і многіх захворванняў. Урачы могуць парэкамендаваць здаць аналізы на вітамін D, жалеза, ферыцін, гармоны шчытападобнай залозы.



> **«Наш эмацыянальны стан — гэта псіхафізіялагічны працэс: не толькі перажыванні, якія мы адчуваем у адказ на нейкую з'яву ці падзею, але і іх «фізіялагічны бок» — тое, што адбываецца ў арганізме ў гэты момант».**

***— Якія прадукты ўключыць у рацыён на доўгачасовай аснове, калі адольвае стомленасць? І якія прадукты могуць быць «хуткай дапамогай» у барацьбе з пастаяннай дрымотнасцю (замест кавы і «хуткіх» вугляводаў)?***

— У барацьбе з хранічнай стомленасцю на дапамогу могуць прыйсці прадукты, багатыя на карысныя тлушчы, — гэта так званыя суперфуды: арэхі і семачкі, прадукты з вітамінам D і поліненасычанымі тлустымі кіслотамі — ласось, іншая тлустая рыба, печань траскі; прадукты, багатыя на жалеза, — чырвонае мяса, печань, шпінат, малюскі. Не варта забываць і аб агародніне ды садавіне, якія з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі вітамінаў і клятчаткі.

### ІНДЫЧКА СУПРАЦЬ ДРЭННАГА НАСТРОЮ

***— Калі казаць пра мяса: якому аддаць перавагу, каб павялічыць свае псіхалагічныя, разумовыя і фізічныя рэсурсы ў зімовы перыяд?***

— Мяса індычкі — адно з самых карысных па біяхімічным складзе, гэта добрая крыніца лёгказасваяльнага бялку, мінералаў і вітамінаў. Акрамя таго, мяса індычкі багатае на трыптафан — амінакіслату, з якой сінтэзуецца сератанін, таму яго ўжыванне зніжае рызыку дэпрэсіі. Пры недахопе жалеза на першае месца выходзіць ялавічына. А вось свініна — няхай не самае карыснае мяса, але вельмі энергаёмістае, багатае на бялкі, тлушчы і вітаміны групы B. Яно добра падыдзе людзям з павышанымі фізічнымі нагрузкамі і тым, хто працуе на холадзе.

***— Павялічыць або скараціць колькасць «павольных» вугляводаў — каш, вырабаў з цвёрдых сартоў пшаніцы?***

— Вугляводы ў здаровага чалавека павінны складаць прыкладна палову рацыёну. Зразумела, гэта павінны быць «павольныя» вугляводы, такія як крупы, злакі і гародніна. Злакі — выдатная крыніца не толькі энергіі, але і раслінных бялкоў, тлушчаў, вітамінаў і мінералаў. Таму скарачаць іх у рацыёне не варта, аднак ёсць некаторыя правілы іх ужывання. Многія кашы ўтрымліваюць фіцінавую кіслату, якая перашкаджае засваенню карысных мінералаў (кальцыю, жалеза, магнію і цынку). Замочванне і прарошчванне дазваляюць паменшыць утрыманне фіцінавай кіслаты і актывізаваць фітазу — фермент, што нейтралізуе фіцінавую кіслату.

### АДКУЛЬ БРАЦЬ ВІТАМІНЫ

***— «Зімовая» садавіна — ці будзе ад яе толк?***

— На прылаўках крам можна знайсці шмат замежнай «зімовай» садавіны. Часцей за ўсё пакупнік



выбірае апельсіны, мандарыны, ківі, бананы. Сапраўды, яны могуць служыць добрай крыніцай вітаміну C і клятчаткі. «Зімовыя» яблыкі, якія могуць захоўвацца яшчэ з восеньскага ўраджаю, вядома, прайграюць свежым па ўтрыманні вітамінаў.

> **«Дэпрэсія часта звязана з недахопам сератаніну — так званага гармона шчасця, ён сінтэзуецца пад уздзеяннем ультрафіялетавых прамянёў. І прычынай зімовай дэпрэсіі найчасцей становіцца менавіта дэфіцыт сератаніну, што звязана з кароткім светлавым днём».**

Таксама хочацца сказаць і аб замарожаных ягадах, у якіх пры правільнай замарозцы можа захавацца да 2/3 карысных рэчываў. Напрыклад, аскарбінавая кіслата, адзін з самых няўстойлівых вітамінаў, лепш захоўваецца ў замарожаных прадуктах, чым пры пакаёвай тэмпературы. Таксама добра захоўваюцца пры замарозцы і антыаксіданты.

***— Гародніна і зяляніва, вырашчаныя «на гідрапоніцы»: ці змогуць яны паставіць у арганізм хоць нейкія вітаміны?***

— Гародніну і зяляніва, што былі вырашчаныя «на гідрапоніцы», нельга назваць абсалютна беднымі па вітамінна-мінеральным складзе. Расліны пры дадзеным спосабе вырошчвання сілкуюцца растворам, добра насычаным мінеральнымі рэчывамі. Аднак хімікаты, якія выкарыстоўваюцца пры гідрапоніцы, могуць быць шкодныя. Гэта нітраты, цяжкія металы, яны назапашваюцца ў арганізме. Таму замест «зімовых» зяляніва і гародніны лепш аддаць перавагу сезоннай гародніне — квашанай капусце, рэдзьцы, рэпе, моркве і дайкону.

***— Ці можна абысціся зімой без вітамінных комплексаў гараджаніну, які купляе гародніну і садавіну ў краме?***

— Пры разумна складзеным рацыёне без дадатковых вітамінных комплексаў можна абысціся. Дастаткова дадаць у рацыён усе групы прадуктаў: збожжавыя, бабовыя, гародніну, садавіну, мяса, рыбу, морапрадукты, малочныя і кісламалочныя прадукты, раслінныя алеі. Па даных розных даследаванняў, у 70-80 % жыхароў нашай паласы выяўляюцца дэфіцыты трох і нават больш важных для жыццядзейнасці вітамінаў і мікраэлементаў. Таму не заўсёды прыём полівітамінных комплексаў — гэта панацэя. Бо мы ведаем, што многія мінералы канкуруюць у таблетцы за ўсмоктванне, многія вітаміны разбураюцца. Найлепшы спосаб — гэта кантраляваць важныя элементы і вітаміны ў арганізме, сачыць за сімптомамі і пры наяўнасці скаргаў звяртацца да ўрача.

***— Ганна Аляксандраўна, ці можна скласці пералік з некалькіх прадуктаў, якія трэба ўключыць у рацыён зімой, каб падтрымаць арганізм і не дапусціць традыцыйнага для лютага-сакавіка заняпаду сіл?***

— Так, можна скласці спіс прадуктаў, якія трэба есці зімой. Пра многія з іх мы казалі вышэй.

- Гэта цэльныя злакі для энергіі: «Геркулес», грэчка, проса, карычневы рыс.
- Бабовыя: фасоля, сачавіца, гарох, нут.
- Гародніна: бульба, морква, буракі, капуста, гарбуз, квашаная капуста, замарожаная гародніна (брокалі, цвятная капуста, спаржавая фасоля), сельдэрэй, рэдзька.
- Арэхі і насенне: тут падыдуць любыя арэхі і насенне чыя.
- Садавіна і замарожаныя ягады: апельсіны, мандарыны, гранаты, ківі, лімоны, авакада, хурма, брусніцы, журавіны.
- Алей.
- Тлустая рыба.
- Малочныя і кісламалочныя прадукты.
- Мяса і субпрадукты.
- Спецыі для бадзёрасці: карыца, перац, куркума, кардамон, бадзян.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 18 марта 2022 года торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе и в подвижном составе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

| № предмета торгов | Место размещения средства рекламы (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Количество и размер средства рекламы | Материал изготовления средства рекламы | Срок действия договора | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Станция метро «Петровщина», ВБ-1 | Лайт-бокс | 1,2 м × 1,8 м – 2 ед.<br>2,25 м × 1,2 м – 4 ед. | Алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 26 апреля 2022 года по 25 апреля 2027 года | 1 199,45 |
| 2 | Станция метро «Петровщина», ВБ-2 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 2 ед. | | | 389,44 |
| 3 | Станция метро «Площадь Ленина», ВБ-1 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 12 ед.<br>2,5 м × 1,25 м – 1 ед. | | с 26 апреля 2022 года по 25 апреля 2027 года | 6 126,96 |
| | | Рекламный стенд с подсветкой | 0,6 м × 1,5 м – 6 ед. | Алюминиевая рамка, лист ПВХ, самоклеящаяся пленка | | |
| | | Рекламный стенд без подсветки | 0,6 м × 1,5 м – 1 ед.<br>2,0 м × 1,5 м – 1 ед. | | | |
| 4 | Станция метро «Ковальская Слобода» | Лайт-бокс | 2,5 м × 1,25 м – 1 ед. | Алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 5 мая 2022 года по 4 мая 2027 года | 97,36 |
| 5 | Станция метро «Немига», ВБ-1 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 11 ед. | | | 2 141,92 |
| 6 | Станция метро «Немига», ВБ-2 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 11 ед. | | | 2 141,92 |
| 7 | Станция метро «Кунцевщина», ВБ-1 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 6 ед. | | | 584,16 |
| 8 | Станция метро «Кунцевщина», ВБ-2 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 6 ед. | | | 584,16 |
| 9 | Станция метро «Спортивная» | Лайт-бокс | 2,0 м × 1,0 м – 3 ед.<br>2,25 м × 1,2 м – 2 ед. | | с 16 мая 2022 года по 15 мая 2027 года | 486,80 |
| 10 | Входные – выходные группы постоянных дверей 25 станций метро: «Уручье», «Борисовский тракт», «Московская», «Парк Челюскинцев», «Академия Наук», «Площадь Победы», «Октябрьская», «Институт Культуры», «Петровщина», «Малиновка», «Каменная Горка», «Кунцевщина», «Спортивная», «Пушкинская», «Молодежная», «Фрунзенская», «Купаловская», «Первомайская», «Пролетарская», «Тракторный завод», «Партизанская», «Автозаводская», «Могилевская», «Площадь Франтишка Богушевича», «Юбилейная площадь» | - | размер рекламного поля до 20 см × 80 см или до 0,16 кв. м включительно<br><br>Итого: 210 ед. | Самоклеящаяся пленка с удаляемым прозрачным клеевым слоем | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 4 749,50 |
| 11 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 мм × 315 мм в каждом 2-м, 4-м вагонах первой линии метрополитена | Рекламный плакат формата А4 (210 мм × 297 мм) | По первой линии – в 33-х составах: каждый 2-й, 4-й вагоны (места №№ 2, 4, 6, 10, 14, 18, 30, 36, 38, 40), нижний ряд – 10 ед. Итого по 1-й линии: 660 ед. | Немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м² | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 4 835,42 |
| 12 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 мм × 315 мм в каждом 1-м, 3-м, 5-м вагонах второй линии метрополитена | Рекламный плакат формата А4 (210 мм × 297 мм) | По второй линии – в 30-ти составах: каждый 1-й, 3-й, 5-й вагоны (места №№ 2, 4, 6, 10, 14, 18, 30, 36, 38, 40), нижний ряд – 10 ед. Итого по 2-й линии: 900 ед. | Немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м² | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 6 593,76 |
| 13 | Рекламный плакат в верхнем поясе салона вагонов первой и второй линии метрополитена, размещаемый в информационном кармане SAN 435 мм × 145 мм | Рекламный плакат (423 мм × 133 мм) | По первой линии – в 33-х составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 7 ед. (места №№ 50, 57, 62, 63, 64, 67, 68). Итого по 1-й линии: 1 155 ед. По второй линии – в 30-ти составах: каждый 1-й, 5-й вагоны – 6 ед. (места №№ 57, 62, 63, 67, 68, 78); каждый 2-й, 3-й, 4-й вагоны – 6 ед. (места №№ 50, 57, 62, 63, 67, 68). Итого по 2-й линии: 900 ед. ВСЕГО: 2 055 ед. | Немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м² | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 4 997,76 |
| 14 | Рекламный плакат в верхнем поясе салона вагонов первой и второй линии метрополитена, размещаемый в информационном кармане SAN 435 мм × 145 мм | Рекламный плакат (423 мм × 133 мм) | По первой линии – в 33-х составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 7 ед. (места №№ 75, 78, 79, 82, 83, 84, 85). Итого по 1-й линии: 1 155 ед. По второй линии – в 30-ти составах: каждый 1-й, 5-й вагоны – 5 ед. (места №№ 79, 82, 83, 84, 85); каждый 2-й, 3-й, 4-й вагоны – 6 ед. (места №№ 78, 79, 82, 83, 84, 85). Итого по 2-й линии: 840 ед. ВСЕГО: 1 995 ед. | Немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м² | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 4 851,84 |
| 15 | Рекламный плакат, размещаемый в вагоне М-110 второй и третьей линии метрополитена, (проем между дверями и окном) | Рекламный плакат формата 465 мм × 665 мм | По второй линии – в 4-х составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 3 ед. (места №№ 1-2; 1-3; 2-2). Итого по 2-й линии: 60 ед. По третьей линии – в 6-ти составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й вагоны – 3 ед. (места №№ 1-2; 1-3; 2-2). Итого по 3-й линии: 72 ед. ВСЕГО: 132 ед. | Плакаты, выполненные на матовой самоклеящейся пленке ПВХ с клеевыми присосками, толщиной 100–120 мк., с легкосъемным, прозрачным и точечно нанесенным клеем (печать производить с использованием латексных и UV-чернил) | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 6 540,86 |
| 16 | Рекламный плакат, размещаемый в вагонах М-110 второй и третьей линии метрополитена, (проем между дверями и окном) | Рекламный плакат формата 465 мм × 665 мм | По второй линии – в 4-х составах: каждый 1-й вагон – 2 ед. (места №№ 2-1; 2-3); каждый 2-й, 3-й, 4-й вагоны – 3 ед. (места №№ 1-1; 2-1; 2-3); каждый 5-й вагон – 2 ед. (места №№ 1-1; 2-3); Итого по 2-й линии: 52 ед. По третьей линии – в 6-ти составах: каждый 1-й вагон – 2 ед. (места №№ 2-1; 2-3); каждый 2-й, 3-й вагоны – 3 ед. (места №№ 1-1; 2-1; 2-3); каждый 4-й вагон – 2 ед. (места №№ 1-1; 2-3). Итого по 3-й линии: 60 ед. ВСЕГО: 112 ед. | | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 5 549,82 |
| 17 | Ламинированный плакат, размещаемый в верхнем поясе в торце вагонов первой и второй линии метрополитена | Ламинированный плакат формата 1 200 мм × 280 мм | По первой линии – в 33-х составах: каждый 1-й или 5-й вагоны – 33 ед.; Итого по 1-й линии – 33 ед. По второй линии – в 30-ти составах: каждый 1-й или 5-й вагон – 30 ед. Итого по 2-й линии – 30 ед. ВСЕГО: 63 ед. | Самоклеящаяся пленка с удаляемым прозрачным клеевым слоем | с 1 апреля 2022 года по 31 марта 2025 года | 1 467,04 |
| 18 | Первая и вторая линия вагонов метрополитена (потолочная часть вагона) | Монитор с ЖК-экраном диагональю 18,5 дюйма без трансляции аудиоконтента | По первой линии – в 6-ти составах: 2 монитора в вагоне с диагональю 18,5 дюйма. Итого по 1-й линии: 60 ед. По второй линии – в 6-ти составах: 2 монитора в вагоне с диагональю 18,5 дюйма. Итого по 2-й линии: 60 ед. ВСЕГО: 120 ед. | - | с 1 июня 2022 по 31 мая 2027 года | 6 384,00 |

**Форма проведения торгов** – аукцион.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Государственное юридическое лицо** – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **18 марта 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 17.02.2022 **по 14.03.2022** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583 (назначение платежа – задаток для участия 18.03.2022 в торгах на право заключения договора на размещение средств рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором на размещение средств рекламы);
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – www.mgcn.by (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – www.metropoliten.by, Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «Объявления – Аукционы»).

## Проведение первых торгов по продаже имущества ООО «Паритет Риэлт»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. | Задаток 10 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Объекты недвижимости на праве собственности, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Рабочая, д. 23 (В, Г, Е), на земельных участках на праве постоянного пользования, с кадастровыми номерами: 741000000008002847, пл. 0,2294 га; 741000000008002848, пл. 0,0859 га; 741000000008002849, пл. 0,4708 га; 741000000008002850, пл. 0,0909 га; 741000000008002852, пл. 0,0726 га; 741000000008002945, пл. 0,0086 га; 741000000008002946, пл. 0,0197 га; 741000000008002947, пл. 1,0633 га; 741000000008002948, пл. 0,1834 га; 741000000008002949, пл. 0,3004 га; 741000000008002950, пл. 0,115 га,<br>В составе:<br>1. Админ. здание, пл. 1138,2 кв. м, инв. № 710/С-53735.<br>2. Админ. здание, пл. 270 кв. м, инв. № 710/С-53742.<br>3. Канализационно-насосная станция, пл. 19 кв. м, инв. № 710/С-53714.<br>4. Компрессорная, пл. 77,5 кв. м инв. № 710/С-53733.<br>5. Мебельный цех № 1 (уч. 1), пл. 3727 кв. м, инв. № 710/С-53732.<br>6. Мебельный цех № 2, пл. 4560 кв. м, инв. № 710/С-53737.<br>7. Склад № 1, пл. 342,8 кв. м, инв. № 710/С-53740.<br>8. Склад № 2, пл. 331 кв. м, инв. № 710/С-53734.<br>9. Склад, площ. 422 кв. м, инв. № 710/С-53716.<br>10. Склад ГСМ, пл. 177 кв. м, инв. № 710/С-53715.<br>11. Сушильное отделение и котельная, пл. 630 кв. м, инв. № 710/С-53736.<br>12. ТП-115 Бобруйск, пл. 39 кв. м, инв. № 710/С-53739.<br>13. ТП-98 Бобруйск, пл. 113 кв. м, инв. № 710/С-53738.<br>14. Ограждение территории, пл. 1360,8 кв. м, инв. № 710/С-53959.<br>15. Пожарный водоем, пл. 0 кв. м, инв. № 710/С-53932.<br>16. Пожарный водоем, пл. 0 кв. м, инв. № 710/С-53969.<br>17. Дорога асфальтно-ц/бетонная, пл. 7065 кв. м, инв. № 710/С-53930.<br>18. Водопроводная сеть Бобруйск, пл. 0 кв. м, инв. № 710/С-53928;<br>19. Канализационная сеть, протяженность 259,1 м, инв. № 710/С-53967;<br>20. Кабел. линия 6 кВ ТП115-ТП98, протяж. 89,1 м, инв. № 710/С-53971. | 219 080,28 | 21 908,03 | 10 954,02 |

Торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 66, пом. 142-1, **18 марта 2022 г., в 10.00.**

Продавец – ООО «Паритет Риэлт», тел. +37529-1868683.

**Заявление на участие в торгах и необходимые в соответствии с законодательством документы (платежный документ с отметкой банка, копии устава, доверенность**, паспорт, приказ)**, должны быть поданы с 09.00 15.02.2022 по 17.00 15.03.2022 по адресу организатора торгов.**

Задаток на участие в торгах должен быть перечислен по **15.03.2022** на счет организатора торгов – ООО «Климат Сити», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2-10, тел. +375259113010, р/с BY21ALFA30122792010010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», код ALFABY2X. Участник торгов в момент подачи заявления на участие в торгах обязан заключить с организатором торгов договор о залоге и зарегистрироваться в журнале регистрации участников. Победителем признается лицо, предложившее наивысшую цену в ходе торгов, а в случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного участника (претендента на покупку), лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. По результатам торгов организатором составляется протокол, отражающий ход и результат их проведения, указывается победитель торгов, а в случае участия лишь одного участника – ему предлагается приобрести лот по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Рабочая, 23, предварительно согласовав время визита. Цена указана без учета НДС по ставке 20 %. Победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 5 дней с даты торгов возмещаются затраты связанные с организацией и проведением торгов, в том числе на публикацию объявлений о торгах в размере 255,31 руб., а также аукционный сбор в размере 2 % от окончательной цены продажи лота с учетом НДС.

Срок подписания договора купли-продажи по 28.03.2022, оплата предмета торгов – не позднее 10.04.2022.

# НА СТЫКУ НАВУКІ І ВЫТВОРЧАСЦІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Лабараторыя прызначана для вялікага спектра работ, — канстатуе **старшы выкладчык кафедры Міхаіл ПЯТРЭНКА**. — Тут будуць шліфаваць сваё майстэрства студэнты 3–4 курсаў па дысцыплінах, накіраваных на павышэнне іх навыкаў у абслугоўванні, рамонце, дыягностыцы аўтамабіляў. Тут для іх запланавана не менш за 20 лабараторных заняткаў, маецца восем рабочых месцаў, якія можна выкарыстоўваць адначасова.

Лабараторыя аснашчаная ўсім неабходным для дыягнаставання сістэмы сілкавання інжэктарнага рухавіка, гідраўлічнай тармазной сістэмы з ABS, праверкі і ачысткі бензінавых фарсунак.

— У нашым распараджэнні знаходзіцца комплекс дыягнастычнага абсталявання, які аб'яднаны ў адзіны праграмны пакет BOSCH ESI (tronik) 2.0, — удакладняе старшы выкладчык. — Мы яго набылі ў рамках вучэбнай бестэрміновай ліцэнзіі. Гэты комплекс дазваляе не толькі чытаць памылкі пры праверцы кампанентаў, але і праводзіць тэставыя работы. Напрыклад, дазваляе праверыць стартар на спажыванне току пры запуску.

Сёння такое абсталяванне прымяняецца на аўтасэрвісах — і ў студэнтаў з'явілася ўнікальная магчымасць атрымаць найбольш поўнае ўяўленне аб рабоце з яго кампанентамі, каб адпавядаць тым патрабаванням, якія сёння заяўляе вытворца на сваіх сэрвісных станцыях.

Міхаіл Пятрэнка звяртае ўвагу на тое, што ў камплекце ёсць увесь неабходны інструмент для правядзення дыягностыкі аўтамабіля. З дапамогай праграмы выяўляецца любая няспраўнасць. Гэта найбольш поўны пакет праграмнага забеспячэння, які на дадзены момант пастаўляе фірма BOSCH. Тут ёсць уся неабходная інфармацыя, якую студэнты выкарыстоўваюць пры выкананні курсавых і дыпломных работ. Магчымасці лабараторыі дазваляюць максімальна засвоіць тыя навыкі і кампетэнцыі, якія адпавядаюць патрабаванням, існуючым на сэрвісных станцыях і прадпрыемствах, куды ў далейшым размяркоўваюцца студэнты.

— Адкрыццё лабараторыі — своеасаблівае свята для нашага ўніверсітэта, які летась адзначыў сваё 60-годдзе, — гаворыць **доктар тэхнічных навук, прафесар, рэктар БРУ Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ**. — Унікальнасць лабараторыі ў тым, што тут, па сутнасці, адбыўся стык сучаснай адукацыі і сучаснай вытворчасці. У нас ва ўніверсітэце існуе, на мой погляд, магутны аўтамабільны кластар. Мы рыхтуем спецыялістаў у галіне праектавання, канструкцыі аўтамабіляў, перспектыўнай спецыяльнасці — электраабсталявання. І ёсць дзве вельмі важныя спецыяльнасці, якія звязаны з тэхнічнай эксплуатацыяй аўтамабіляў і аўтасэрвісам. Гэта інжынеры-эксплуатацыйнікі, якія прызваныя ведаць сучаснае абсталяванне і рамантаваць, а яно з кожным годам ускладняецца. Вельмі прыемна, што адна з наймацнейшых нашых кафедраў «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў» ва ўзаемадзеянні з сусветным лідарам — фірмай «Роберт БОШ» стварыла такую перадавую вучэбную лабараторыю. Гэта будзе садзейнічаць далейшаму развіццю супрацоўніцтва адукацыі і вытворчасці і павышаць кваліфікацыю нашых спецыялістаў.



Супрацоўнікі ўніверсітэта ў адзін голас кажуць, што мець такую лабараторыю для ўніверсітэта, які ўключаны ў праграму 3.0, не толькі прэстыжна, але і вельмі актуальна.

— У нас адкрыты доктарскі Савет па абароне кандыдацкай і доктарскай дысертацый менавіта па нашай спецыяльнасці «колавыя і гусенічныя машыны», — звяртае ўвагу **загадчык кафедры «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў» Вольга БІЛЫК**. — Гэта дыягнастычная лабараторыя дапаможа павысіць узровень навучанасці студэнтаў, іх прафесіяналізм.

У сярэднім выпуск кафедры складае 80 чалавек. Яе можна смела лічыць мужчынскай: сёння тут няма прадстаўніц прыгожага полу. І было відаць, як у хлопцаў загарэліся вочы, калі яны азнаёміліся з «начынкай» лабараторыі.

— Вельмі сур'ёзнае абсталяванне, самыя сучасныя тэхналогіі, — ацаніў падзею студэнт 3-га курса Уладзіслаў Бурко. — Усё гэта вельмі дапамагае развівацца. Тэхналогіі і аўтамабілі не стаяць на месцы, хочацца даведвацца пра нешта новае, каб быць у курсе апошніх распрацовак. Будзе карысна прайсці падрыхтоўку на такім перадавым абсталяванні.

— Наогул Беларуска-Расійскі ўніверсітэт аснашчаны самым сучасным абсталяваннем па шмат якіх кірунках, — дадае Міхаіл Лусцянкоў. — Аўтамабільны кірунак, звязаны з распрацоўкай аўтатранспарту і яго эксплуатацыяй, знаходзіцца ў прыярытэце. Мы даўно і плённа супрацоўнічаем з такімі гігантамі беларускага аўтамабілебудавання як БелАЗ, МАЗ, МТЗ. Лічу, што мы рыхтуем дастойных спецыялістаў не толькі для Беларусі, а і Саюзнай дзяржавы.

У рамках супрацоўніцтва ўніверсітэта і фірмы «Роберт БОШ» некалькі выкладчыкаў універсітэта прайшло навучанне па вучэбных праграмах фірмы і атрымала адпаведныя сертыфікаты. Гэта дае ім права перадаваць атрыманыя веды студэнтам. Лабараторыя таксама будзе выкарыстоўвацца ў якасці пляцоўкі для правядзення семінараў і майстар-класаў спецыялістамі фірмы «Роберт БОШ».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Дзеля памяці

# «ЖЫЦЦЁВІНКІ» СПЫНІЛІСЯ...

## Сышоў з жыцця драматург Васіль Ткачоў

**«Мне заўсёды, скажу шчыра, шанцавала на добрых людзей. Калі нешта ў мяне і не складвалася, нікога ў тым не віню... Акрамя самога сябе!»**



Словы, якія мог сказаць толькі разумны, добры і мудры чалавек... А прамовіў іх у нашай з ім гутарцы вядомы пісьменнік, драматург, пастаянны аўтар «Звязды» Васіль Ткачоў... Здаецца, трох месяцаў не прамінула ад тае гутаркі. Спадар Васіль быў, як заўсёды, энергічны і поўны планаў. Але 14 лютага прыйшла сумная вестка з Гомеля: Васіля Ткачова не стала. 1 студзеня яму споўнілася 74 гады.

А нарадзіўся ён у вёсцы Гута Рагачоўскага раёна, з 1980-га жыў у Гомелі. Былі і старонкі біяграфіі, звязаныя з далёкімі прасторамі: калі прызвалі ў армію, служыў на касмадроме Байканур інструктарам палітычнага аддзела па камсамольскай рабоце, потым скончыў факультэт журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча, быў ваенным карэспандэнтам у Сярэдняй Азіі. Але вярнуўся на Беларусь, і мала хто так прывязаны да сваёй малой радзімы... Усё жыццё прысвечана роднай Гомельшчыне. Тут працаваў у раённых і абласных газетах, на мясцовым тэлебачанні вёў перадачу... І тыпажы для сваіх шматлікіх твораў браў ад землякоў. Нездарма пісьменнік — ганаровы грамадзянін Рагачоўскага раёна. Яшчэ да абвяшчэння Года гістарычнай памяці Ткачоў разумеў, наколькі гэтая тэма важная, браў удзел у праекце «Мы — родам з Гуты»: *«Так, я планую ў найбліжэйшы час паставіць на могілках стэлу-помнік, на якой будуць прозвішчы ўсіх землякоў, якія знайшлі сваё апошняе прыстанішча далёка ад бацькоўскага кутка. Калі мы гэта не зробім сёння, то хто зробіць заўтра? Такіх людзей трэба помніць. Дарэчы, Гута ганарыцца сваім ураджэнцам, Героем Савецкага Саюза, гвардыі генерал-маёрам Міліпам Ерафеевічам Жгіровым... Недзе пад Санкт-Пецярбургам пахаваны і мой дзядзька Васіль Данілаў, у гонар якога я і нашу сваё імя. Прадбачу той час, калі і яго прозвішча ўбачу на стэле...»*

Цяпер час увекавечваць і імя Васіля Ткачова. Толькі пералік ягоных заслуг, як сцэнарыста і драматурга зойме не адну старонку... За кнігу п'ес «Характары» ў 2017 годзе Васіль Ткачоў стаў лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Драматургія». А былі яшчэ прэміі Саюза беларускіх журналістаў і міжнародная прэмія «Дружба» за нарыс «Сонцам хлеб на стале», прэмія Федэрацыі прафсаюзаў у галіне літаратуры за кнігу прозы «Снукер» і прэмія імя Васіля Віткі за творы для дзяцей.

А чытачы «Звязды» шмат гадоў з задавальненнем чыталі напісанае Васілём Ткачовым, ад зацемак да вялікіх артыкулаў, ад апавяданняў да мініяцюр, так званых жыццёвінак... Дзе не толькі пільныя назіранні і ўменне з гумарам глядзець на жыццё, але і шчырае спачуванне героям. Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» смуткуе з нагоды смерці светлага чалавека, нашага даўняга аўтара. Але жыццё пісьменніка не заканчваецца з тым, што ў яго біяграфіі па другі бок рыскі, якая падзяляе гады нараджэння і смерці, з'яўляецца яшчэ адна лічба. Мы будзем працягваць чуць голас Васіля Ткачова на сцэнах тэатраў, з экранаў, са старонак кніг.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Продавец** | **ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 470- 18Б/2017** |

**Предмет аукциона**

**Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО»**

*(регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 04 января 2019 г.).*

Состав имущества и имущественных прав см. на сайте ipmtorgi.by

Месторасположение производственной базы – **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**

**Начальная стоимость лота без НДС – 40 800,00 бел. руб.** (снижена на 40 %)

Шаг аукциона без НДС – 2 040,00 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30 |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок, указанный выше, заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** (пять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере **3 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.11.2021; в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие». – 2021. – № 11. – С. 60-61

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 15.03.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 15.02.2022 по 14.03.2022 до 17.00** по указанному адресу

**Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, ipmtorgi.by. E-mail: auction@ipmconsult.by**

**Отчет Местного благотворительного Фонда «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» об использовании своего имущества за 2021 год**

Местный благотворительный Фонд «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: Могилевская область, Мстиславский район, аг. Мазолово, ул. Центральная, д. 12.

1. Учредители фонда: Кириленко В.П., Иванкович Т.И., Стаховская И.О., Аврамчик Н.А., Сведомская Т.Ю., Шеладубова З.И., Лапуденко В.П., Чепикова А.В., Антюхова Н.П., Куксовский В.В..

2. Информация о стоимости имущества фонда:

- имущество, переданное учредителями фонда, – 1500 рублей 00 копеек;
- доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – нет;
- доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой в порядке, предусмотренном действующим законодательством, – нет.

3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе:

- расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 1135 рублей 56 копеек.

4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц. УНП 790613142

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «МГЦН»**
**4 марта 2022 года в 11.00**
**проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды машино-мест, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)**

| Предмет аукциона (срок договора аренды, наименование, место нахождения недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион) | Площадь, кв. м | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|
| Машино-место по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-224 | 18,0 | 76,05 |
| Машино-место по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-231 | 17,8 | 75,21 |
| Машино-место по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-253 | 18,2 | 76,90 |

Договоры аренды заключаются сроком на **3 года**

**Организатор аукциона** – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

**Срок и место приема заявлений:** с 11 февраля 2022 г. по 1 марта 2022 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)

**Телефон для справок** +375 (17) 360 42 22. УНП 190398583

**Суд Оршанского района и г. Орши Витебской области** в связи с обращением Денисенко Ирины Викторовны с заявлением об объявлении гражданина умершим разыскивает ВИТКОВСКОГО Павла Александровича, 11 октября 1953 года рождения, уроженца г. Гомель, последнее известное место жительства: Витебская область, г. Орша, ул. Ленина, д. 149.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине, сообщить суду Оршанского района и г. Орши Витебской области в течение двух месяцев с момента публикации.

# «ХТО НЕ ЛЮБІЦЬ НАРОДНУЮ ХТО НЕ АДЧУВАЕ РАДАСЦІ, ЯКУЮ ЯНА ЎЛІВАЕ ТОЙ НЯШЧАСНЫ, СА СКАЛЕЧАНАЙ

## Рыгор Шырма напісаў п'есу пра змаганне

**«Я памятаю, як першы раз убачыў яго. На нарадзе маладых пісьменнікаў у 1955-м, здаецца, годзе. Выйшаў невысокі, сівы, як адуванчык, чалавек з абліччам ці то настаўніка, ці то гэткага беларускага Дон Кіхота і загаварыў прыемным глухаватым голасам, з гэткім мяккім пружанскім акцэнтам «гэ-то-го», «за-мно-го». Загаварыў у віслыя вусы і сівую эспаньёлку рэчы, якія адразу зачаравалі нас. І адразу высветлілася, якая велічная рэч наша песня, колькіх кампазітараў, ад Манюшкі да Рымскага-Корсакава, яна натхняла. І загучала арыя з «Галькі», заснаваная на мелодыі нашай песні, і «Песня Леля», якой на самай справе з'яўляецца наша «Ой, ляцеў арлішча». І цяпер з усведамлення яе велічы нас не саб'е ніхто».**

Так успамінаў пра знаёмства з легендарным дырыжорам, фалькларыстам, хормайстрам Рыгорам Шырмам Уладзімір Караткевіч.

Мала хто столькі зрабіў для беларускай культуры, мае столькі ўзнагарод і здзейсненых праектаў, як гэты чалавек, які нарадзіўся 130 гадоў таму ў вёсцы Шакуны Пружанскага павета ў простай сялянскай сям'і.

Давайце паспрабуем знайсці пра яго штосьць цікавае ў матэрыялах Беларускага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва.

### «ЗА ВАШЫМІ ПЫШНЫМІ СУДЗЕЙСКІМІ ТОГАМІ Я БАЧУ СВАЕ ПАЛЯШУЦКІЯ СВІТКІ»

Асобнага фонду Рыгора Шырмы, на маё здзіўленне, няма — здаецца, таму, што не перададзены хатні архіў. Але таго, што датычыцца знакамітага музыкі, можна знайсці дастаткова ў іншых фондах.

Напрыклад, вось алічбаваны дакумент — копіі матэрыялаў камендатуры польскай паліцыі аб дзейнасці беларускіх арганізацый у Польшы 1926 г. Справаздача на сотню з лішнім старонак... Сярод іншага чытаем:

*«У дні 1 снежня адбыўся ў Вільні сход чальцоў Таварыства школы беларускай з мэтай стварэння гуртка ў цэнтры горада. У склад новага гуртка ўвайшлі...»* І першым стаіць прозвішча Шырма.

Так, Рыгор Шырма ў Заходняй Беларусі быў асобай небяспечнай для тых, хто хацеў, каб беларусаў не існавала. Ён адмаўляўся запісвацца палякам — і не мог уладкавацца на працу, нават пашпарт атрымаць. Давodзілася нават працаваць лесарубам... У архіве знаходзім яго ліст да Браніслава Тарашкевіча ад 15.09.1922 г. *(у гэтым і далей прыведзеных лістах захаваная аўтарская арфаграфія)*:

*«Шаноўны пане Тарашкевіч!*

*Давно ожидаю от Белорусского Национального Комитета предвыборную литературу и инструкции...*

*А теперь еще раз позволю себе обратиться к Вам с самой горячей и убедительной просьбой предоставить мне место учителя, где найдете возможным. Даю Вам слово, что буду весьма полезен, как учитель и, следовательно, как работник по возрождению Белоруссии. Жить до крайности тяжело. До сих пор ютился с семьей в хлебном сарае. Вся надежда только на Беларускі комитет и в частности на вас.*

*Григорий Ширма».*

Дарэчы, калі віленскі ваявода Бацянскі прапанаваў Шырму купіць яго фальклорныя запісы, каб іх пераклалі і выдалі як польскія, Рыгор Шырма адказаў: «Каб перакласці народныя песні, трэба геній Адама Міцкевіча, а так як у вас яго няма, то гэта будзе тое самае, што абліць гэты белы абрус атрамантам!»

Рыгора Шырму арыштоўвалі некалькі разоў. Вось што ён сказаў на апошнім судзе: «За вашымі пышнымі судзейскімі тогамі я бачу свае паляшуцкія світкі, дзеля асветы якіх мы працуем, і з гэтага кірунку нас не саб'е ніхто і ніколі».

Заўважце, як апошнія словы перагукаюцца са словамі Караткевіча пра Шырму!

Важны дакумент, які захоўваецца ў архіве, — асабістая справа Рыгора Шырмы, заведзеная на яго ў Саюзе кампазітараў БССР 5 студзеня 1949 года.

У адной з анкет пра свой побыт у Заходняй Беларусі Шырма апавядае, што, нягледзячы на цяжкасці, *«было дано более 200 лекций о литературе, музыке и белорусском народном творчестве. Записано и положено на ноты до 2-х тысяч белорусских народных мелодий. За свою работу подвергался репрессиям со стороны польских панов: два раза сидел в Лукишской тюрьме, несколько раз бывал под арестом, произведено в моей квартире несколько десятков полицейских обысков».*




### НЕВЯДОМАЯ П'ЕСА

У архіве захоўваецца шэраг лістоў Рыгора Шырмы да перакладчыка з Масквы Яўгенія Мазалькова. Вось ліст ад 12 жніўня 1951 г.:

*«Дорогой Евгений Семенович!*

*Помню, когда-то при встрече со мною вы дали согласие на то, чтобы я прислал вам для отзыва первое написанное мною произведение.*

*У меня получилась 4-х-актная пьеса — «Сонца глянула з Усходу». Я ее в нашем Союзе еще не показывал. Если Вы согласны прочитать ее и сделать свои замечания, я охотно Вам один экземпляр вышлю. Мне осталось только чисто перепечатать на машинке. Содержание пьесы — борьба с панской оккупацией и момент освобождения. Эта тема никем в Советской литературе не затронута.*

*Собрал много интересного материала для задуманной прозы. Стоит ли приступать? Буду ждать Вашего ответа».*

А 20 кастрычніка да Мазалькова трапляе згаданая п'еса разам з суправаджальным лістом:

*«Дорогой Евгений Семенович!*

*Много всяких дел у меня с моим хором, поэтому еле кончил перепечатывать свою пьесу. Раньше я назвал было ее «Заглянула сонца і ў наша ваконца», но заглавие показалось мне длинным, и я переменил на другое — «Сонца глянула з Усходу».*

*Может, мне и не следовало связываться с писательским делом, но другой раз досада берет, что у нас так мало внимания уделяется освободительному движению в Западной Белоруссии: два-три произведения и обчелся.*

*Какое впечатление произведет на Вас «Сонца глянула з Усходу» — даже не могу себе представить. Видимо, сценические недотяжки будут большие, но литературный матерьял быть может и покажется не лишенным интереса.*

*Для новых сочинений много матерьяла накопилось еще со времен Великой Отечественной войны. Темы и герои ходят неотступно за мною, но приступить к работе нет времени.*

*Ваше мнение для меня очень дорого. Если найдете пьесу заслуживающей внимания, разрешите Ваш отзыв о ней показать Горбунову Тимофею Сазоновичу. Он по-настоящему интересуется вопросом воссоединения Белоруссии, да и в самой пьесе есть моменты политического порядка, о которых мне нужно будет с ним посоветоваться.*

*Песня в пьесе должна быть одним из главных действующих лиц, поэтому не удивляйтесь, что их так много. Песня была одним из сильнейших средств агитационной борьбы с панской оккупацией.*

*Мой искренний привет Вам с пожеланием доброго здоровья.*

*С большим нетерпением буду ждать Вашего письма.*

*Душевно преданный Вам*
*Ваш Г.Ширма.*
*20.10.51, Гродно».*



Адразу заўважым, што змена назвы п'есы была невыпадковай. «Загляне сонца і ў наша ваконца» — беларуская выдавецкая суполка, якая існавала ў Пецярбургу ў 1904—1914 гадах, сярод яе кіраўнікоў былі тыя, хто ў 1951 годзе лічыўся ворагам народа.

І вось перад намі стос пажаўцелых аркушаў, на першым з якіх напісана: «Сонца глянула з Усходу». П'еса ў 4-х актах, 8-мі карцінах. 1951 год».

Сярод дзеючых асоб — Астап Бондар 80 гадоў, яго ўнучка Алёнка, Васілёк Русін — 22-гадовы студэнт, Захвея, яго матка, Пархвен Кіпцюр, сельскі кулак, абшарнік, урадавы саветнік Дыхавіцкі, даверaны пана Дыхавіцкага Галганскі, ксёндз — малады фанатык, польскі настаўнік... Як сведчыць рэмарка да першай карціны, «дзея адбываецца ў Заходняй Беларусі ў часы панскай акупацыі».

У п'есе шмат біяграфічнага, Васілёк — гэта і сам Шырма, і паэт Міхась Васілёк, якім Шырма захапляўся і чый дэбютны зборнік «Шум бaравы» выдаў на свае грошы, пакуль аўтар сядзеў у Лукішках. Маці героя п'есы Васілька Захвея — ці не любімая цётка Шырмы Захвея Васільеўна, ад якой Рыгор Шырма запісаў дзве сотні песень? А дзед Астап Бондар, у вусны якога ўкладзена шмат мудрасці, ці не дзед Рыгора Шырмы, па мянушцы Майстровіч?

Паколькі наўрад вы дзе прачытаеце тэкст гэтай п'есы, перакажу яе вам.

На пачатку адразу ж сустракаемся з галоўным героем — беларускай песняй, якая далятае праз адчыненае акно ў пакоі пана Дыхавецкага:

*Чырвоная каліначка,*
*Чаго ў лузе схілілася?*
*Маладая дзяўчыначка,*
*Чаго яна журылася?*
*— Ой, таму я журылася,*
*Што ад роду адбілася.*
*Адбілася ад радочку,*
*Цяжка майму галасочку.*

Песня абрана зусім невыпадкова. Хоць сэнс яе — туга маладой нявесткі па роднай сям'і, аўтар п'есы відавочна ўкладаў у яе ідэю, якая вярэдзіла яго ўсё жыццё: чалавеку нельга «адбівацца ад роду», слухаць тых, хто сцвярджае, што беларуская песня — халопская, нявартая.

Першая з'ява пачынаецца рэплікай ксяндза — «Спяваюць хамы». І далей ён разважае: *«Няхай іх д'яблі разнясуць з іхнімі спевамі. Цяпер спяваюць «Чырвоную каліну», бо мы праз адчыненае вакно слухаем, а тады, калі мы не чуемо, заводзяць комуністычны інтэрнацыянал. Іхняя песня — гэта плашчык, пад каторым камуна нясе сваю прапаганду: спеваюць песні, а з-пад палы сыплюць адозвы. Лементуюць, што хочуць развіваць сваю народную культуру, а нас завуць акупантамі».*

Ксяндза падтрымлівае польскі настаўнік:

*«Так, проша ксендза, пашаны да нас не вельмі многа нават у дзяцей. Адзін раз у класе пытаюцца ў мяне, калі будзе беларуская школа. Я толькі адказаў: — тады будзе, як рак засвішча, — як раптам чую, адзін шубравец, уткнуўшы пальцы ў рот, аглушыў мяне свістам. Усе пачалі рагатаць і крычаць: — Рак свішча, давай, пане, школу беларускую!»*

Далей мы даведваемся, што перад намі — засяданне Абароны Крэсаў Усходніх, члены якога абмяркоўваюць, як апалячыць Заходнюю Беларусь і вынішчыць камуністычныя павевы. А беларуская песня — самы моцны сродак супраціву беларусаў. Дыхавецкі прапануе стратэгію: *«Нам трэба падзяліць вёску, знайсці прыхільнікаў сабе».* Гэта значыць — каго купіць, каго запалохаць, каго і зусім ліквідаваць.

Потым бачым сцэну, у якой польскі паліцыянт прыходзіць на песню вясковых дзяўчат і патрабуе, каб тыя спявалі па-польску, бо Беларусь — бальшавіцкая выдумка, а «з вашай хамскай мовай да Смаргоні не даедзеш».

І гэта Шырма не раз чуў.

А вось цікавая сцэна, у аснове якой рэальны выпадак: паліцыянт прыходзіць у хату да Васілька, бачыць партрэты Пушкіна, Талстога, Купалы і Коласа і нападае на Захвею:

*«А то цо за божышча? То ж Кароль Маркс, святовэй славы комуніста! За того достане твуй сынэк кілька лет вянзеня».*

Але ўмешваецца сяброўка Васілька Алёнка.

*«Пакажы, пакажы, паночку!.. Як жа пану не сорамна! Вось табе і паляк! Гэта ж ваш польскі мастак, Ян Матэйка, які намаляваў абраз «Бітва пад Грунвальдам», як усе славяне і ліцвіны разам пакалашмацілі нямецкіх рыцараў аж у 1410 годзе...»*

У п'есе шмат разважанняў пра моц народнай песні. Кулак Пархвен называе яе «забаўка, цацачка». Дзед Астап пярэчыць:

*«Хто не любіць народную песню, хто не адчувае радасці, якую яна ўлівае ў душу чалавека, той няшчасны, пакрыўджаны богам калечанаю душою».*

Васілька спакушаюць звярнуцца па пасаду да польскіх улад, але ён сустракаецца з іншымі падпольшчыкамі. Вось ягоны таварыш Міхась дакладае:

*«У Баруны прыехала цэлая місія каталіцкая на чале з біскупам. Адзін ксёндз крычаў цэлы дзень, што вяра каталіцкая з'яўляецца мурам проці бальшавізма, што ад грахоў будзе звольнены той, хто змагаецца з камунаю, хто выдае і даносіць. А нашы хлопцы праскідалі адозвы ля касцёла, пад аркаю, якую збудавалі на спатканне біскупа, і нават на алтар ухітрыліся пакласці».*

Думаецца, і гэта невыпадковы і нявыдуманы эпізод. У Барунах, побач з касцёлам, у памяшканні былой базыльянскай школы, у 1920 годзе была адчынена Беларуская настаўніцкая семінарыя, а ў 1921-м польскімі ўладамі зачы-

# ПЕСНЮ, Ў ДУШУ ЧАЛАВЕКА, ДУШОЙ»

## заходніх беларусаў

нена, нягледзячы на пратэсты, і там пачала працаваць польская настаўніцкая семінарыя.

Між тым у вёсцы ўзнікае канфлікт за зямлю — пан Дыхавіцкі хоча прадаць яе мужыкам задорага, Васілёк раіць проста забраць. Дзед Астап таксама гаворыць палымяную прамову, і моладзь нясе яго на руках пад песню на верш Паўлюка Труса, прысвечаны змагарам Заходняй Беларусі:

*Арлы маладыя — няволі сыны,*
*Узнімайце халодныя крыллі.*
*Хоць рукі закованы*
*ў сталь-кайданы,*
*І сілу рыхтуйце вы сіле.*

Моладзь вёскі ладзіць вечарыну, на якой у масках чытаюць забароненыя вершы: «Мы будзем змагацца за лепшую, светлую долю для роднага беднага брата» Змітрака Бядулі, «Будзь смелым. Магутна ярмо друзгачы» Янкі Купалы. Між тым Пархвен з Галганскім дамаўляюцца, як загубіць Васілька: трэба падкінуць яму да хаты чырвоны штандар і адозвы. Нягледзячы на абурэнне сялян, Васілька закавалі ў кайданы і звозяць. Але ў хуткім часе прыходзіць Чырвоная Армія.

*«На раздарожжу за ваколіцай сабралася цэлая вёска. Стаяць сталы накрытыя кілімамі. На сталах хлеб-соль. Дзеці і моладзь з кветкамі. Грае музыка. Чуваць, як па дарозе праходзіць Армія».*

Вяртаецца з няволі Васілёк. Дзед Астап гаворыць узнёслую прамову пра тое, што «Занясу падзяку ў Крэмль Роднаму і Добраму Бацьку Сталіну», і ўсе пяюць інтэрнацыянал.

### «РУКА ТЯНЕТСЯ К ПЕРУ, НО ОБСТАНОВКА ДЛЯ РАБОТЫ ПОКА НЕПОДХОДЯЩАЯ»

П'еса Рыгора Шырмы, вядома, не шэдэўральная, хоць тут ёсць жывыя кавалкі, і выдатны галоўны герой — беларуская песня.

Давайце ўвойдзем у кантэкст стварэння «Сонца глянула з Усходу».

Вызваленне Заходняй Беларусі Рыгор Шырма, вядома, вітаў з радасцю. І ўсё нібыта складаецца добра: славутаму дырыжору даручаюць стварыць Беларускі ансамбль песні і танца. Ён натхнёна працуе... Але пачынаецца вайна. Шырма эвакуіраваўся ў Сібір. Тут ён працягвае працаваць, кіруе хорам. Але ў 1942-м яго арыштоўваюць, нават перасылаюць на Лубянку — вядома ж, ён быў знаёмы з многімі падазронымі беларускімі дзеячамі.

Шырму саслалі ў Паўночны Казахстан... Яго выручыў Якуб Колас, які жыў у эвакуацыі ў Ташкенце. Аднойчы да яго прыйшлі артысты хору Шырмы, просячы выратаваць іх кіраўніка, Колас звярнуўся да Панцеляймона Панамарэнкі.

Пасля вайны Шырму давялося пасяліцца ў Гродне. Трэба было рэабілітавацца, даводзіць сваю прыхільнасць савецкай ідэалогіі. Адсюль у п'есе ўвесьчаснае падкрэсліванне, што народная песня нясе не толькі беларускасць, але і бальшавізм, дабраверныя выказванні пра Крэмль і Сталіна... Многія падобныя рэчы выглядаюць устаўкамі, бо яшчэ ў 1939-м Рыгор Шырма піша Мазалькову: *«Имею дерзкое намерение прислать Вам в недалёком будущем для консультации одну вещь. Что Вы мне на это скажете? Гневаться не будете?»*

У тым жа лісце ён згадвае: *«О Васильке нет никаких известий. Это наш поэт-мученик. Сколько пыток моральных и физических претерпел он от панских жандармов».*

Вельмі верагодна, што гаворка ідзе пра п'есу, якая тады называлася «Загляне сонца і ў наша ваконца», з героем, правобразам якога быў паэт Васілёк, пра лёс якога аўтар клапаціўся і пра якога, як паведамляе ў тым жа лісце, збіраўся пісаць літаратурна-біяграфічны артыкул.

У лісце да Мазалькова ад 25.01.1940, дасланым з Беластока, які тады быў на тэрыторыі БССР, Шырма піша: *«Рука тянется к перу, но обстановка для работы пока неподходящая. Нет времени, я люблю работать спокойно и много переделывать. Сырья для обработки имею порядочно, в случае грех поступает можно ли будет прислать вам?»*

Магчыма, зноў гаворка пра тую ж п'есу, якую ў 1951-м перарабіў.

А вось і яшчэ важная прычына, чаму Шырма ўзяўся за давядзенне да ладу п'есы. У 1951 годзе ён далучаны да падрыхтоўкі Другой дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве, якая адбудзецца ў 1955 годзе. У Першай дэкадзе, у маі 1941-га, Шырма прымаў удзел разам са сваім ансамблем песні і танца і меў вялізны поспех. Ашаламляльны поспех мелі і спектаклі беларускіх тэатраў, напрыклад, оперы «Кветка шчасця», заснаваная на беларускім фальклоры, і «У пушчах Палесся», па аповесці Якуба Коласа «Дрыгва», зноў жа — пра барацьбу беларусаў супраць польскіх акупантаў. Думаю, гіпотэза, што Шырма меркаваў прасунуць сваю п'есу для пастаноўкі падчас Другой дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, дастаткова праўдападобная. Для таго ямy і патрэбны водгук Мазалькова для сакратара ЦК КПБ Гарбунова.

Але Мазалькоў маўчыць. Часы памяняліся, тэма беларускай культурнай самабытнасці не такая актуальная на фоне барацьбы з нацдэмамі, якія былі вынадзейны і сярод удзельнікаў Першай дэкады.

28 снежня 1951 года з Гродна Шырма зноў піша Мазалькову: *«Послал вам машинную рукопись пьесы «Сонца глянула з Усходу», боюсь, что она пропала, и Вы ее не получили. А быть может и прочитать не хватает терпения? Если найдете чуточку времени, не откажите черкнуть хоть пару слов».*

Але, падобна, Мазалькоў так і не паспрыяў таму, каб п'еса Рыгора Шырмы была пастаўлена ці надрукавана. І яна засталася проста цікавым артэфактам эпохі. А вось Шырма са сваім ансамблем зноў выступіў на Дэкадзе бліскуча і пасля гэтага атрымаў званне народнага артыста СССР, а ансамбль — статус Дзяржаўнай харавой капэлы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ЧАТЫРЫ СТАГОДДЗІ БУКВАРА

**Сёння буквар стаў беларускім брэндам. Больш за 400 гадоў таму надрукаваны на беларускіх землях, ён паспеў заваяваць дзясяткі краін свету, на ім навучаюцца мільёны дзяцей. Нават само слова «буквар» можна знайсці ў рускай, украінскай, балгарскай, баснійскай, сербскай, харвацкай, чувашскай, дагестанскай і іншых мовах.**




Доўгі час пра гэта дасягненне айчыннай асветніцкай думкі мы амаль нічога не ведалі. Вывучэнне гісторыі буквара ўскладнялася і тым, што мала старажытных кніг захавалася — імі актыўна карысталіся. Некаторыя выданні маюцца толькі ў адным, радзей двух экзэмплярах, і тое знаходзяцца далёка за нашымі межамі.

### БЕЛАРУСКІ БРЭНД

Дзякуючы намаганням кнігазнаўцы, культуролага, **намесніка генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандра СУШЫ** ў 2012 годзе быў перавыдадзены найбольш старажытны айчынны буквар з тых, што на сёння захоўваюцца ў Беларусі. Менавіта тады даследчык задумаў узяцца за гісторыю кнігі, па якой вучыліся нашы продкі. На пошукі пайшло каля 10 гадоў. Звесткі па крупінках ён збіраў па ўсім свеце: у бібліятэках, музеях, архівах, прыватных калекцыях. Яму ўдалося адшукаць самую першую ў свеце кнігу пад назвай «Буквар», і ў нашай краіне ўжо святкавалася 400-годдзе з дня яе выхаду ў свет.

Былі знойдзены і іншыя невядомыя і рэдкія выданні, сабрана інфармацыя, якая пацвярджае, што беларусы маюць сапраўдны культурны скарб. Пры гэтым нашы продкі мелі дачыненне да таго, што гэты культурны феномен стаў сусветнай з'явай — беларусы ці ўраджэнцы нашых земляў спрычыніліся да выхаду падобных кніг на іншых мовах і ў замежных краінах.

Вынікам даследчыцкай дзесяцігодкі стала грунтоўнае выданне «Беларускі Буквар у нацыянальнай і сусветнай прасторы», прэзентацыя якога адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы і сабрала гасцей з выдавецтваў, музеяў, навучальных і навуковых устаноў. Пры рабоце над кнігай было выкарыстана больш за тысячу архіўных і апублікаваных крыніц. Сабрана каля сямі соцень здымкаў з фондаў 68 устаноў і прыватных калекцый розных краін.

— Такой фундаментальнай навуковай працы ў гісторыі буквароў, ні айчыннай, ні блізкага замежжа, яшчэ не было. Гэта цудоўная крыніца для кнігазнаўцаў, педагогаў, сучасных аўтараў і тых, якім трэба будзе пісаць новыя падручнікі, — заўважыла **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі і навукова-даследчага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі, кандыдат педагагічных навук, аўтар сучаснага буквара Вольга ЦІРЫНАВА**.

Таксама выйшла кніга Аляксандра Сушы ў серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя» «Выпаходніцтва буквара ў Беларусі», адаптаванае пад сярэдніх і старшых школьнікаў.

Намеснік дырэктара выдавецтва «Беларусь» Вольга Ваніна прызнала сімвалічным тое, што прэзентацыя такіх выданняў праходзіць у Год гістарычнай памяці. Гэта выдатная магчымасць прасачыць гістарычны шлях буквара ад першых рукапісных выданняў да сучаснасці.

Дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім Лакіза выхад выдання назваў падзеяй у гісторыі беларускай дзяржаўнасці і выказаў згадку, што, магчыма, без буквара мы б не мелі гонару звацца беларусамі.

### СКАРБНІЦА

Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца. Буквар не стаў выключна падручнікам для навучання чытанню. Аляксандр Суша нават параўнаў яго з Канстытуцыяй:

— Праз яго любы чалавек сёння ўваходзіць у свет ведаў і каштоўнасцяў той краіны, у якой жыве. Адкрыйце сучасны беларускі буквар альбо старажытны — там заўжды ёсць галоўныя дзяржаўныя сімвалы, веды пра краіну, яе гарады, прыроду, гістарычных асоб. Нават у старажытных букварах XVII стагоддзя былі дакладна, дэталёва прапісаны хрысціянскія каштоўнасці. Буквар у нейкім сэнсе — гэта кніга, якая фарміруе нацыю, адзінства, цэласнасць.

Для чалавека, які яшчэ не прачытаў ніводнай кнігі, адкрываецца сапраўдная скарбніца. Дзіця мусіць зразумець, у якой краіне жыве, да якога народа мае дачыненне і якой культурай можа ганарыцца. Гэта адчувалі вядучыя дзеячы беларускага Адраджэння. Працавалі над букварам Максім Багдановіч і Якуб Колас, Карусь Каганец і Цётка, буквары стварылі кіраўнікі Акадэміі навук. Так, кіраўнік Інбелкульта Сцяпан Некрашэвіч быў аўтарам першага беларускага савецкага буквара. Уявіце: акадэмік шчыруе над падручнікам для навучання пісьменнасці. Але вучоны разумеў, што стварэнне такой кнігі — выключна важная справа, трэба было папулярызаваць маральныя, грамадскія, дзяржаўныя арыенціры, і гэта рабілася праз буквар.

**Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Шрыфтам Скарыны

**У Нацыянальнай бібліятэцы адкрылася выстаўка «Скрозь стагоддзі», прысвечаная 500-годдзю «Малой падарожнай кніжкі». Яна арганізавана сумесна з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў і прадстаўляе работы студэнтаў, магістрантаў і мастакоў-выкладчыкаў факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтары паспрабавалі зрабіць рэканструкцыю тытульнага ліста «Малой падарожнай кніжкі», які, на жаль, да нашага часу не дайшоў.**




Першая кніга, надрукаваная на землях Вялікага Княства Літоўскага, у першай тутэйшай друкарні, пакінула багата загадак. Адна з іх — якая ж была яе назва. Даследчыкі падгледзелі ў тэксце выраз «у гэтай малой падарожнай кніжцы» і вырашылі яго выкарыстаць як назву — лепш, чым выданне без імя. Шмат спрэчак было і наконт года яе з'яўлення на свет. З афармленнем кнігі таксама не ўсё проста — высветлілася, што частка гравюр у ёй запазычана з найлепшых, найпрыгажэйшых выданняў XV стагоддзя. Даследчыкі да гэтага часу спрачаюцца наконт паслядоўнасці частак, з якіх яна складаецца.

Але, бясспрэчна, менавіта з кніг Скарыны пачалася на нашых землях выдавецкая справа і была закладзена кніжная культура.

Праца першадрукара працягвае натхняць і сучасных мастакоў. Яны шчыруюць над шрыфтамі і малюнкамі Скарыны і на іх аснове спрабуюць ствараць новыя. Сучасныя тэхналогіі, магчымасці камп'ютарнай графікі і лічбавага друку дазваляюць выдаваць сапраўды ўнікальныя рэчы.

Дэкан факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Усевалад Свентахоўскі, чые работы таксама прадстаўлены на выстаўцы, у лічбавым фармаце аднавіў скарынінскія шрыфты, а таксама стварыў уласныя наборы драўляных літар для высокага друку фарбамі.

Прарэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Андрэй Васілеўскі стварае самаробную паперу (метадам ручнога чэрпання) і робіць факсімільныя адбіткі тытульных старонак выданняў XVI стагоддзя.

Экспазіцыя знаёміць з серыяй работ, выкананых у тэхніцы высокага друку і камп'ютарнай графікі, з эксперыментамі сучасных мастакоў, якія працуюць у межах традыцыйных формаў шрыфтавой графікі і натхняюцца эстэтыкай старажытнай першакрыніцы.

У экспазіцыі можна ўбачыць фрагменты тэкстаў, цытаты з «Малой падарожнай кніжкі», кампазіцыі, створаныя на падставе ўзораў, пакінутых Скарынам, эксперыменты сучасніка, натхнёных старажытнай спадчынай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «БОЛЬШАЯ ИГРА С GILLETTE»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (далее – Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован приказом начальника главного управления юстиции Гродненского областного исполнительного комитета от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 590828925.

Местонахождение Организатора: 221335, Гродненская обл., Ивьевский р-н, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корп. 1, комн. 6.

Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Большая игра с Gillette**».

**3. Территория проведения.**

Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.

**4. Сроки проведения.**

17.02.2022 – 28.04.2022 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Смаль Арина Олеговна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

Члены комиссии:

1. Солодухо Никита Михайлович, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по развитию.
2. Гулак Анна Владимировна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по маркетингу.
3. Евстратенко Яна Валерьевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», ведущий специалист по рекламной коммуникации.
4. Приявко Оксана Федотовна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции торговой марки GILLETTE, указанной в Приложении 1 (далее – товары-участники), реализуемых в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» и интернет-магазинах ostrov-shop.by, zht.by; zhs.by; zhi.by.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 17.02.2022 по 16.03.2022 включительно:

1. совершить покупку товаров-участников на сумму не менее 15,99 (пятнадцать девяносто девять) белорусских рублей в любом магазине «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» или на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by, с использованием при расчете за покупку дисконтную карту «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты».

Покупатели, осуществляющие расчет за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок», «Карта Fun» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчете картами рассрочек в соответствии с программой лояльности «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса»;

2. достоверно заполнить персональные данные в личном кабинете на сайте ostrov-shop.by (далее – Интернет-сайт) в день совершения покупки (или до момента оформления заказа через интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by), а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);
- дата рождения (обязательно);
- адрес проживания, пребывания в Республике Беларусь: область (обязательно), район (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);
- оператор сотовой связи А1, МТС, life:) (обязательно);

